Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
4 ЛІСТАПАДА 2017 г. СУБОТА №214 (28578)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рэвалюцыя ў нашай гісторыі**
СТАР. 5



**«Лістапад»: пра пітчынг сцэнарыяў**
СТАР. 9



**ДТЗ: афармляць або чакаць інспектара?**
СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

*«У тым праекце грашова-крэдытнай палітыкі на 2018 год, які цяпер падрыхтаваны Нацбанкам, ацэначная лічба па стаўцы рэфінансавання — каля 10%. Мы не маем намеру ў наступным годзе рабіць нейкія вялікія крокі па зніжэнні стаўкі. Нацбанк павінен перакanацца ў стабільнасці плацежнага балансу, стабільнасці інфляцыі. Наша задача па інфляцыі — максімальна замацавацца ў межах 6% плюс-мінус 1-працэнтны пункт. Калі сітуацыя будзе дазваляць прымаць рашэнні больш хуткімі тэмпамі, мы гэта будзем рабіць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9806 | ▲ |
| Еўра | 2,3068 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0734 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# ГАЮЧАЯ ВАДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ



Жыхарка вёскі Пакрашава Слуцкага раёна, былая загадчыца дзіцячага садка, а цяпер пенсіянерка Алена ПУЦЯТА і васьмігадовая школьніца са Слуцка Валерыя ЛЕШЧАНКА, якая прыехала на канікулы ў бацькоўскую вёску, сустрэліся на крыніцы. Пакрашаўская крыніца — вядомая на Случчыне. Алена Вацлаваўна расказвае сваёй малой зямлячцы пра тое, што ў гэтай вёсцы было раней больш за дзясятак крыніц, але толькі гэтую — на ўскраіне, аздобілі і назвалі ў гонар абраза Божай Маці Вастрабрамскай, паставілі два крыжы — праваслаўны і каталіцкі. Сюды прыходзяць вернікі ўсіх канфесій.
**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Акцэнт на здароўе

## ВА ЎСІМ ВІНАВАТЫЯ... ЖАНЧЫНЫ?

### Моцны пол мог бы жыць даўжэй, але штосьці пастаянна перашкаджае

**Мужчыны жартуюць, што спачатку жанчыны выпіваюць з іх усю крою, а пасля цягнуць да ўрача. Што характэрна, медыкі пацвярджаюць: многія мужчыны на прыём да ўрача трапляюць менавіта з падачы жонак. Прынцып такога клопату быў узяты на ўзбраенне ў адной еўрапейскай краіне, дзе сярод жанчын пачалі праводзіць агітацыйную работу па прыцягненні мужчын да абследавання на прастатспецыфічны антыген (ПСА). Выяўленне раку прастаты на ранніх стадыях істотна вырасла — чаго і варта было чакаць.**



**Вучоныя сцвярджаюць, што ў беларускіх мужчын верагоднасць дажыць да 75 гадоў не перавышае 25 працэнтаў, у жанчын — удвая вышэйшая. Статыстыка сведчыць, што мужчыны жывуць гадоў на 7—10 менш за жанчын. Такім сумным разрывам ужо даўно не могуць «пахваліцца» многія, многія краіны. У развітым свеце размова ідзе пра адзін — максімум тры гады розніцы. Можа, замежніцы лепш умеюць угаворваць сваіх непахісных своечасова хадзіць да ўрача? Напэўна. Але ж на медыцыну спадзявайся, а сам...**
СТАР. 7

■ Нерухомасць

## АРЭНДА БЯРЭ ДРУГУЮ ХВАЛЮ?

### У сталіцы склалася сітуацыя, калі проста не хапае бюджэтных кватэр

**Калі вы вырашылі зняць кватэру ў лістападзе, будзьце гатовыя паламаць дзіды і аб'ездзіць увесь Мінск у пошуках прыстойнага варыянта. Бо большасць добрых кватэр ужо занятыя маладымі сем'ямі або студэнтамі, а гаспадары вакантных апартаментаў не спяшаюцца зніжаць цану пасля сезоннага ажыятажу. Праўда, стаўкі на здымныя кватэры ў сталіцы стабілізаваліся і цяпер знаходзяцца прыкладна на тым жа ўзроўні, што і летам. Па словах экспертаў, самую бюджэтную аднапакаёвую кватэру, якая знаходзіцца ў хоць трохі нармальным стане, можна арандаваць не танней, чым за 180 долараў у месяц.**



**Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік аддзела арэнды аднаго з буйных агенцтваў нерухомасці Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.**
СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!
Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ З нагоды

# ВЯДУЧАЕ МЕСЦА

**Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў унёс значны ўклад у стварэнне і станаўленне нацыянальнай прававой сістэмы.**

Аб гэтым гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нагоды 20-годдзя НЦЗПД, якое агучыў на ўрачыстым сходзе намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Міцкевіч.




Арганізацыя займае вядучае месца ў заканапраектнай дзейнасці краіны, карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод дзяржаўных органаў, уключаных у гэты працэс, адзначаецца ў віншаванні. «Цэнтрам унесены значны ўклад у стварэнне і станаўленне нацыянальнай прававой сістэмы, развіццё і ўдасканаленне заканадаўства ў розных сферах грамадскага жыцця, фарміраванне высокай прававой культуры грамадства, забеспячэнне правоў і законных інтарэсаў грамадзян і арганізацый», — гаворыцца ў віншаванні ■

■ Соцыум

# ГАЛОЎНАЕ — ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЗАНЯТАСЦЬ

**І новая рэдакцыя дэкрэта №3 накіравана менавіта на гэта. Так заявіў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што новая рэдакцыя дэкрэта мае іншы падыход — яна накіравана на забеспячэнне занятасці, а не на выплату збору.**



Сёлета, паводле слоў першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, назіраецца павелічэнне колькасці заяўленых наймальнікамі вакансій. Іх фактычна ў два разы больш, чым зарэгістраваных беспрацоўных у краіне. Але, на жаль, у кожным рэгіёне прысутнічае дысбаланс попыту і прапановы. Часта патрабуюцца спецыялісты з канкрэтнымі навыкамі і кампетэнцыямі, у той час як зарэгістраваныя беспрацоўныя імі не валодаюць, з-за чаго і не могуць уладкавацца на работу.

Цяпер рыхтуюцца планы развіцця на 2018 год, якія будуць распрацоўвацца фактычна на ўзроўні кожнага раёна. У гэтых планах, па словах Андрэя Лабовіча, адным з ключавых блокаў павінен стаць блок менавіта па кадравым патэнцыяле ў кожным рэгіёне.

Дарэчы, ужо да канца гэтага года ў нашай краіне плануецца павысіць зарплаты некаторым бюджэтнікам. Пра гэта Андрэй Лабовіч распавёў у эфіры тэлеканала «СТБ». Прыбаўка закране ў першую чаргу нізкааплатныя катэгорыі работнікаў бюджэтнага сектара. У сярэднім плануецца павелічэнне выплат на 7%.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by* ■

■ Дзеля бяспекі

# НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ЯКАСЦІ

## У Брэсце адбылося чарговае пасяджэнне Ваеннага камітэта АДКБ

Яго ўдзельнікі разгледзелі пытанні, звязаныя з праведзенымі сёлета сумеснымі мерапрыемствамі аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, а таксама рэагаваннем на ўзнікненне крызісных сітуацый у зоне адказнасці АДКБ. Акрамя таго, было абмеркавана развіццё ваенна-палітычнай абстаноўкі ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі, у сувязі з чым вызначаны рызыкі, пагрозы і выклікі ўнутраным рэгіянальным і нацыянальным інтарэсам.

Як зазначыў **старшыня Ваеннага камітэта, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ,** зараз мы выходзім на больш якасны ўзровень у рашэнні пытанняў планавання, прымянення і разгортвання не толькі калектыўных сіл аператыўнага рэагавання, а і ўвогуле ўзброеных сіл, якія здольны і гатовы выканаць задачы сумеснага прымянення на любой тэрыторыі краін — членаў АДКБ.

— Пытанню развіцця ваеннага складніка арганізацыі кіраўнікамі дзяржаў — удзельнікаў АДКБ удзяляецца вялікая ўвага, — перакананы **начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ генерал-палкоўнік Анатоль СІДАРАЎ.** — У наступным годзе працягнецца практыка раптоўных праверак воінскіх і іншых фарміраванняў, якія ўваходзяць у склад калектыўных сіл АДКБ.

А завяршальным мерапрыемствам гэтага года стануць вучэнні калектыўных сіл Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, якія ўжо ў гэтым месяцы пройдуць у Таджыкістане. У манеўрах будзе задзейнічана каля 5 тысяч ваеннаслужачых, вялікая колькасць тэхнікі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by* ■

■ Трэба ведаць

# Міністры едуць у рэгіёны

**Кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных ураду, у лістападзе правядуць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах Беларусі.**

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, ужо на наступным тыдні — 9 лістапада — запланаваны прыёмы грамадзян у міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда ЗАЙЦА ў Гродзенскім аблвыканкаме, а таксама ў старшыні Белдзяржпраму дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці Мікалая ЯФІМЧЫКА ў Рэчыцкім райвыканкаме.

Міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ сустрэнецца з грамадзянамі ў Клічаўскім райвыканкаме 17 лістапада, міністр спорту і турызму Аляксандр ШАМКО — у Слуцкім райвыканкаме 22 лістапада. У пятніцу, 24 лістапада, асабісты прыём правядуць міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК у Петрыкаўскім райвыканкаме і старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА ў Жлобінскім райвыканкаме.

На 28 лістапада ў Смаргонскім райвыканкаме запланаваны прыём грамадзян ва ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леаніда ГУЛЯКІ. 30 лістапада міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ выедзе ў Лепельскі райвыканкам, а міністр па падатках і зборах Сяргей НАЛІВАЙКА — у Салігорскі райвыканкам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

■ Міжнароднае жыццё

# Патрэбна зона свабоднага гандлю

## Стварыць яе як мага хутчэй заклікаў беларускі прэм'ер

**Учора ў Ташкенце (Узбекістан) адбылося пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

Як паведамляе БЕЛТА, падчас пасяджэння **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ** заявіў, што Беларусь выступае за найхутчэйшае стварэнне зоны свабоднага гандлю паслугамі і паўнавартаснага агульнага рынку дзяржзакупак у СНД. Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што над першым у СНД працуюць ужо 6 гадоў. Аператыўнае завяршэнне гэтай работы — свайго роду гарантыя пабудовы на базе СНД буйнога рэгіянальнага цэнтра сучасных і высокатэхналагічных паслуг.

Агульны рынак дзяржзакупак — ключавы элемент зоны свабоднага гандлю. Адкрытасць і раўнапраўе ўмоў удзелу нясуць патэнцыял росту ўзаемнага гандлю паміж дзяржавамі Садружнасці.

Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што спектр супрацоўніцтва ў рамках СНД досыць шырокі, аднак яго асноваю была і застаецца эканамічная сфера. Беларускі бок прапануе акцэнтаваць увагу на такіх пытаннях, як пабудова агульных рынкаў і стварэнне роўных умоў гаспадарання.

На пасяджэнні прынята рашэнне аб ходзе рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб зоне свабоднага гандлю ад 18 кастрычніка 2011 года. Таксама прынята заява кіраўнікоў урадаў дзяржаў СНД аб кансалідацыі намаганняў сусветнай супольнасці для эфектыўнага процідзеяння міжнародным картэлям. Расія як дзяржава, якая цяпер старшынствуе ў Садружнасці, распаўсюдзіць тэкст заявы ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і іншых міжнародных арганізацыях.

Сярод важных падпісаных дакументаў у эканамічнай сферы — пагадненне аб абмене інфармацыяй, неабходнай для вызначэння і кантролю мытнага кошту тавараў у дзяржавах — удзельніцах СНД. Акрамя таго, падпісаны пратакол аб змяненні ў пагадненне аб правілах вызначэння краіны паходжання тавараў у СНД ад 20 лістапада 2009 года. Таксама на пасяджэнні ўхвалены канцэпцыі аб супрацоўніцтве краін СНД у такіх галінах, як нафтагазавае машынабудаванне і меліярацыя зямель, уключаючы планы першачарговых мерапрыемстваў па іх рэалізацыі.

Наступнае пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў СНД плануецца правесці 1 чэрвеня наступнага года ў Душанбэ.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Улады Францыі ўзгаднілі правядзенне рэферэндуму аб незалежнасці Новай Каледоніі

Улады Францыі дасягнулі палітычнага пагаднення па рэферэндуме аб самавызначэнні Новай Каледоніі, паведамляюць французскія СМІ.

«Гэтым вечарам мы прыйшлі да палітычнага пагаднення, і, што не менш важна, у нас з'явіўся давер. Але таксама важна, што застаецца яшчэ шмат работы», — сказаў прэм'ер-міністр Францыі Эдуард Філіп.

Правядзенне рэферэндуму запланавана на 2018 год. У 1998 годзе ў Новай Каледоніі ўжо праходзіў рэферэндум, аднак тады насельніцтва выказалася супраць незалежнасці.

Новая Каледонія — асаблівае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўтварэнне Францыі, якое размешчана на аднайменным востраве і групе невялікіх астравоў у паўднёва-заходняй частцы Ціхага акіяна. Яго насельніцтва складае 245 тыс. чалавек, пераважна меланезійцаў і французаў, сталіца — горад Нумеа.

## Польская знешняя палітыка ў адносінах да Украіны будзе перагледжана

Міністр замежных спраў Польшчы Вітольд Вашчыкоўскі ў інтэрв'ю тэлеканалу TVV-1 заявіў, што знешняя палітыка Польшчы ў адносінах да Украіны будзе перагледжана. Ён адзначыў, што ўкраінская і польская дзяржавы маюць розныя канцэпцыі яднання.

«Мы ўсведамляем, наколькі важная для нас Украіна з палітычнага пункту гледжання, наколькі важная яе незалежнасць, якая з'яўляецца істотным элементам бяспекі Польшчы. Аднак украінцы вырашылі, што пытанні, якія нас падзяляюць, гэта значыць гістарычныя пытанні, павінны адысці на другі ці трэці план. Але так быць не можа», — заявіў ён.

Сярод іншага Вітольд Вашчыкоўскі адзначыў, што Польшча не пагодзіцца з тым, каб дзеянні Украінскай паўстанцкай арміі (УПА) параўноўвалі з дзеяннямі Арміі Краёвай і гаварылі ў гэтым выпадку аб якой-небудзь сіметрыі.

Кіраўнік МЗС заявіў, што цяпер пачалася працэдура, што дазваляе забараніць уезд у Польшчу людзям, якія займаюць радыкальную антыпольскую пазіцыю, — як звычайным украінскім грамадзянам, так і прадстаўнікам улады. Вітольд Вашчыкоўскі нагадаў, што няма іншай такой краіны, як Польшча, якая б так актыўна абараняла інтарэсы суверэннай Украіны на міжнароднай арэне.

У кантэксце таго, што ніядна ўкраінскі бок не дазволіў палякам праводзіць эксгумацыйныя работы на яе тэрыторыі, Вашчыкоўскі не выключае адмены свайго візіту і візіту прэзідэнта Анджэя Дуды ва Украіну.

## Трамп заявіў, што сцяна на граніцы з Мексікай будзе каштаваць не больш як $18 млрд



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп лічыць, што будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай абыдзецца ў 18 млрд долараў ці нават некалькі менш. Аб гэтым ён заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу FOKS NEWS.

«Казалі, што сцяна будзе каштаваць 40 млрд долараў. Яе кошт нават далёка не наблізіцца да гэтай сумы. Гаворка вядзецца менш чым аб палове гэтага», — канстатаваў кіраўнік Белага дома.

Ён растлумачыў, што натуральнымі бар'ерамі стануць таксама горы і рэкі. «У гэтых месцах сцяна не патрэбна», — сказаў прэзідэнт. «Я думаю, што за 18 млрд долараў ці за меншую суму ў нас будзе выдатная сцяна, — адзначыў Трамп. — Цяпер мы ствараем прататыпы, пасля мы зробім выбар».

Сцяна на мяжы з Мексікай — адно з ключавых перадвыбарных абяцанняў цяперашняга прэзідэнта ЗША. Указ аб яе ўзвядзенні ён падпісаў яшчэ 25 студзеня, працягласць сцяны павінна скласці больш як 3 тыс. км.

# ПАСАДАЧНЫЯ ДАХОДЫ

**Больш за 3,5 мільёна рублёў зарабілі лясгасы на рэалізацыі пасадачнага матэрыялу, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Продаж пасадачнага матэрыялу і насення хваёвых драўнінных парод — адзін з артыкулаў даходу гадавальніцкай гаспадаркі лясгасаў міністэрства. За дзевяць месяцаў на рэалізацыі пасадачнага матэрыялу лесагаспадарчыя ўстановы зарабілі 3 мільёны 599 тысяч рублёў. Пры гэтым большая частка выручкі (2 мільёны 652,2 тысячы рублёў) атрымана за кошт продажу на ўнутраным рынку. Што датычыцца насення хваёвых драўнінных парод, дык за студзень—верасень выручка ад іх рэалізацыі склала 678 тысяч рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# ГРАФІК ВЫПЛАТЫ ПЕНСІЙ у перадсвяточныя дні

**7 лістапада ў нашай краіне адзначаецца Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі, таму па рашэнні Савета Міністраў панядзелак 6 лістапада зроблены выхадным днём, а працоўны дзень перанесены на суботу 4 лістапада. А як будуць выплачвацца пенсіі?**

Згодна з інфармацыяй, якую паведамілі ў Белпошце, з 4 лістапада пенсіі будуць выплачвацца ў сельскіх аддзяленнях Брэсцкай і Гомельскай абласцей і ва ўсіх аддзяленнях Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей і Мінска.

У панядзелак 6 лістапада пенсіі можна будзе атрымаць у гарадскіх аддзяленнях Белпошты Брэсцкай і Гомельскай абласцей, а таксама ў Гродне.

7 лістапада працаваць будуць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі.

Нагадваем, што пра рэжым работы аддзяленняў можна даведацца ў call-цэнтры РУП «Белпошта», патэлефанаваўшы па нумары 154.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# Прызначаны дадатковыя цягнікі

**Падчас школьных канікулаў і святочных дзён Беларуская чыгунка прызначыла дадатковыя цягнікі для перавозкі пасажыраў у межах краіны, а таксама ў міжнародных зносінах.**

У міжнародных зносінах прызначаны дадатковыя цягнікі №801/802 Мінск—Вільнюс—Мінск, якія будуць курсіраваць 6 і 7 лістапада. Час адпраўлення цягніка №801 з Мінска ў 8.10, час прыбыцця ў Вільнюс — 10.55 (па мясцовым часе). У адваротным кірунку цягнік №802 будзе адпраўляцца з Вільнюса ў 20.08 (па мясцовым часе) і прыбываць у Мінск у 0.50.

Унутры краіны 4 лістапада прызначаны дадатковыя цягнікі: №642 Мінск—Гомель, час адпраўлення цягніка з Мінска — 18.01, час прыбыцця ў Гомель — 23.35; №663 Мінск—Брэст, час адпраўлення са сталіцы — 18.28, прыбыцця ў Брэст — 23.24; №639 Мінск—Брэст, час адпраўлення цягніка з Мінска — 15.15, час прыбыцця ў Брэст — 19.50; №645 Мінск—Брэст, час адпраўлення — 19.03, час прыбыцця ў Брэст — 23.36; №712 Брэст—Мінск, час адпраўлення цягніка з Брэста — 15.50, час прыбыцця ў Мінск — 19.30; №711 Мінск—Брэст, час адпраўлення з Мінска — 20.07, час прыбыцця ў Брэст — 23.45.

Таксама на 7 лістапада прызначаныя чатыры дадатковыя цягнікі: №642 Камунары—Мінск, час адпраўлення са станцыі Камунары — 14.50, час прыбыцця ў Мінск — 21.22; №664 Брэст—Мінск, час адпраўлення з Брэста — 16.40, час прыбыцця ў Мінск — 20.40; №717 Гомель—Мінск, час адпраўлення з Гомеля — 10.53, час прыбыцця ў Мінск — 14.02; №654 Козенкі—Мінск, час адпраўлення са станцыі Козенкі — 16.03, час прыбыцця ў Мінск — 21.21.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# Лічу сябе ў даўгу перад роднай мовай



**Гродзенку Алену Канстанцінаўну БЕКІШ можна назваць сваідомым падпісчыкам. Яна зрабіла свой выбар на карысць газеты гадоў 10 таму, а можа і больш. А да гэтага выпісвала «Звязду» ад выпадку да выпадку. Свой выбар яна так абгрунтавала:**

— Мне сорамна, што мы так мала гаворым па-беларуску. Вось я і лічу сябе ў даўгу перад нашай мовай. «Звязда» — адна з нямногіх газет, якая падтрымлівае гэта асяроддзе. А я, у сваю чаргу, хачу падтрымаць газету. Таму, хоць і на пенсіі, але працягваю падпісвацца на беларускае выданне.

Магчымасці пагаварыць на роднай мове мала, усе гавораць па-руску ці на «трасянцы», а са старонак газеты я жыўлюся правільнай мовай. Чым мне падабаецца газета? Гістарычнымі экскурсамі, матэрыяламі па культуры. Парадокс, але мы ў Беларусі лепш ведаем гісторыю СССР, сусветную гісторыю, чым сваю. І ў школе некалі выкладалі гісторыю Беларусі амаль што факультатыўна. Цяпер вось са «Звяздой» гэты прабел ліквідую. Спасцігаю многа цікавага аб Беларусі.

Мне падабаецца, што цяпер і на тэлебачанні больш гавораць, і чыноўнікі, і міністры загаварылі па-беларуску, і гэта добры знак, што трэба павярнуцца тварам да нашай мовы. І моладзь таксама цікавіцца. Напрыклад, мой пляменнік, ён грамадзянін Літвы, але акрамя літоўскай, англійскай моў, ведае добра і беларускую. Кажа, што яму гэта патрэбна для работы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# ТРАДЫЦЫІ ПАТРАБУЮЦЬ РАЗВІЦЦЯ

**У дні Коласавага юбілею ў Мінску гасцюе дагестанскі выдавец, літаратар Марат ГАДЖЫЕЎ. Мы задалі колькі пытанняў госцю Беларусі.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Марат, вы ўпершыню ў Беларусі?***

— Быў толькі ў сем гадоў, яшчэ за савецкім часам. Пасля яшчэ — праездам... Фактычна ў гэтыя дні здзяйсняецца мая мара: адкрыць для сябе Беларусь. І найперш — Беларусь літаратурную. Рады, што мая мінская паездка адбылася ў дні, калі ваша краіна, ваш народ святкуе 135-годдзе з дня нараджэння народнага песняра Якуба Коласа, якога добра ведаюць і ў Дагестане.

***— Мне здаецца, адлегласць ад Мінска, Беларусі да Дагестана, Паўночнага Каўказа ў нас зусім невялікая. Мяркую пра гэта, бо бачу ў беларускім літаратурна-мастацкім друку публікацыі пісьменнікаў з Чачні, Кабардзіна-Балкарыі, пісьменнікаў розных народаў Дагестана...***

— І я так думаю, бо відавочным здаецца тое, што нам патрэбна веданне адно пра аднаго. Нашы народы выяўляюць цікавасць да сустрэч, стасункаў. Значыць — і пісьменнікам трэба не адседжвацца ў сваіх кватэрах, а знаходзіць сцежкі-дарожкі для яднання. Што я асабіста і стараюся рабіць — праз выпуск газеты «Горцы», праз арганізацыю многіх сустрэч на кніжнай выстаўцы ў Махачкале «Таркі-Тау». Рады, што на яе прыязджалі паэт Рагнед Малахоўскі, галоўны рэдактар часопіса «Нёман», перакладчык Аляксей Чарота. Спадзяюся на новыя стасункі. Ужо адбылася размова ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Буду рады, калі мяне ці каго яшчэ з дагестанскіх пісьменнікаў запросяць на выстаўку ў Мінск. Шмат пра яе чуў. Ведаю, што яна мае свой аўтарытэт сярод літаратараў розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі.

***— Як, дарэчы, пляцоўкай для сустрэч з пісьменнікамі Расіі з'яўляецца Дзень беларускага пісьменства, у час якога праводзіцца круглы стол беларускіх і замежных пісьменнікаў з агульнай ідэяй: «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго». У апошнія гады ў Беларусь прыязджалі Роберт Мінулін, Рэнат Харыс з Татарстана, Уладзімір Беразеў з Новасібірска, Вячаслаў Ар-Сяргі з Удмурціі, літаратары Масквы — Аляксандр Лівергант, Аляксандр Казінцаў, Яўген Шышкін і шмат хто яшчэ.***

— Вось і з Дагестана, мы спадзяваемся на гэта, прыедуць і Міясат Муслімава, і Бадрутдзін Магамедаў, і Муса Ахмадаў... Кожнаму з іх будзе што расказаць чытачам Беларусі. А мы чакаем у Дагестане літаратурную моладзь. Збіраемся праектаваць розныя беларуска-дагестанскія літаратурныя конкурсы. Чакаем перакладчыкаў паэзіі. І верым, што ўсё так і адбудзецца. Мы ўражаны тымі абсягамі дзяржаўнай падтрымкі, якая вылучаецца ў Беларусі на развіццё літаратуры, кнігавыдання. Бачым у гэтым надзвычай станоўчы вопыт.

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.**

■ Факт

# Дзеля выхавання падрастаючых пакаленняў

## У Капыльскім доследным лясгасе адкрылі дэндрапарк

**Яго плошча склала каля двух гектараў. На гэтай тэрыторыі будуць расці дзясяткі відаў дрэў і кустоў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Праект быў распрацаваны арганізацыяй «Брэстрэстаўрацыя», генпадрадчыкам выступіла «Клецкая ПМС». Разам з тым значную частку работ спецыялісты лясгаса выканалі самі.

Пры будаўніцтве аб'екта былі знойдзены пахаванні. З улікам гэтага прынята рашэнне змяніць першапачатковы праект і пабудаваць у дэндрапарку невялікую каплічку. Нядаўна яна была асвячоная.

Цяпер у краіне дзейнічае цэлая праграма па будаўніцтве дэндрапаркаў і міні-дэндрапаркаў. Асноўная мэта, якую яна мае, гэта экалагічнае выхаванне падрастаючых пакаленняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Футбол. Ліга Еўропы

# СІЛА КАМАНДЫ ВЫЯЎЛЯЕЦЦА, КАЛІ ЦЯЖКА

## У гасцявым паядынку групавога этапу футбалісты барысаўскага БАТЭ пацярпелі паражэнне ад нямецкага «Кёльна»

**Гэты матч на арэне «Райн Энергі Штадыён» сабраў 45 000 гледачоў і стаў вельмі яркім і багатым на галы. Пасля прапушчанага на 16-й хвіліне мяча БАТЭ паказала вельмі добрую гульню, футбалісты не проста два разы трапілі ў вароты саперніка, а зрабілі гэта прыгожа. На 31-й хвіліне вызначыўся Неманья Мілуновіч, а праз дзве хвіліны Мікалай Сігневіч эфектным ударам другі раз засмуціў Ціма Хорна — 2:1. Пасля перапынку гаспадары паскорылі тэмп і яшчэ чатыры разы паразілі вароты Дзяніса Шчарбіцкага. Галявы дубль аформіў японскі легіянер Юя Асака, па разе вызначыліся Серу Гірасі і Мілаш Ёйч. Лік сустрэчы 5:2 на карысць гаспадароў.**

*— Каб разлічваць на нешта ў супрацьстаянні з такім сапернікам, вядома ж, нельга дапускаць столькі памылак і настолькі дрэнна гуляць у абароне,* — адзначыў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр ЕРМАКОВІЧ.** *— Безумоўна, першы тайм складваўся няддрэнна. Мы забілі два мячы, гаспадары сталі атакаваць, мы атрымалі прастору. Але, замест таго каб гэтым скарыстацца, наадварот, прапусцілі. Не ведаю, што можа надламаць каманду, калі яна забівае двойчы, наадварот, хлопцы павінны былі адчуваць упэўненасць.*




*Сітуацыя ў нас цяпер няпростая, але мы павінны з яе выходзіць. Сіла каманды праяўляецца менавіта ў такіх момантах, калі цяжка, а не тады, калі ты ідзеш з вялікім адрывам у чэмпіянаце і ўсё атрымліваецца.*

Лідар квартэта Н лонданскі «Арсенал» прымаў у сябе дома бялградскую «Црвену Звезду» і завяршыў гульню ўнічыю — 0:0. Тым не менш каманда Арсена Венгера ўжо забяспечыла сабе выхад у 1/16 фіналу.

**Становішча камандаў пасля чатырох тураў:** «Арсенал» — 10 ачкоў (розніца мячоў — 8—3), «Црвена Звезда» — 5 (2—2), БАТЭ — 4 (6—10), «Кёльн» — 3 (6—7).

У наступным туры 23 лістапада БАТЭ прыме на полі «Барысаў-Арэны» «Црвену Звезду», футбалісты «Арсенала» згуляюць у гасцях у «Кёльна».

Акрамя «Арсенала», пасля матчаў 4-га тура пуцёўкі ў плэй-оф заваявалі яшчэ 4 клубы. Кіеўскае «Дынама», якое трэніруе беларускі спецыяліст Аляксандр Хацкевіч, «Зеніт» з Санкт-Пецярбурга, бухарэсцкая «Сцяўа» і рымскі «Лацыа». Нагадаем, у 1/16 фіналу трапляюць па дзве найлепшыя каманды з 12 груп Лігі Еўропы, а таксама 8 клубаў, якія фінішуюць на трэціх месцах у групах Лігі чэмпіёнаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ЗАЦІШША ПЕРАД... ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯЙ

**У краіне рэалізуюцца маштабныя планы па паляпшэнні бізнес-клімату для прадпрымальніцтва. У працэсе актыўнага чакання знаходзіцца стратэгічны і беспрэцэдэнтны па важнасці дакумент аб лібералізацыі бізнесу. Але разам з тым мы страцілі радок у рэйтынгу Doing Business 2018 і спусціліся з 37-й на 38-ю пазіцыю сярод 190 дзяржаў. У чым прычына і як выправіць становішча спраў?**

Як ужо паспела паведаміць журналістам **суаўтар справаздачы Валянціна САЛТАН,** гэта зніжэнне звязана з тым, што іншыя краіны правялі больш актыўную рэфармацыйную дзейнасць. У Беларусі сёлета пакуль адбылася толькі адна рэформа. Але мы ўсё яшчэ знаходзімся на 38-й пазіцыі рэйтынга ў параўнанні са 106-й пазіцыяй у 2006 годзе сярод прыкладна 150 краін.

Нагадаем, што пры складанні справаздачы «Вядзенне бізнесу — 2018» даследаваліся сферы жыццядзейнасці прадпрымальніцтва, сярод якіх «Атрыманне дазволаў на будаўніцтва» — 22-е месца (у справаздачы 2017 года — 28-е), «Рэгістрацыя ўласнасці» — 5-е месца (без змяненняў), «Падаткаабкладанне» — 96-е месца (99-е), «Дазвол неплацежаздольнасці» — 68-е месца (69-е). У даследаванні Doing Business 2018, якое праходзіла з 1 ліпеня 2016-га па 1 ліпеня 2017 года, для Беларусі ўлічылі рэформу па паказчыку «Крэдытаванне» — стварэнне рэестра рухомай маёмасці, абцяжаранай закладам. У Мінэканомікі чакаюць, што падрыхтаваны сёлета і ўжо часткова прыняты пакет дакументаў па ўдасканаленні ўмоў вядзення бізнесу, накіраваных на развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, паўплывае на вынікі наступнага даследавання.

Падчас Кастрычніцкага эканамічнага форуму «Асновы будучыні» **першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль МАЦЮШЭЎСКІ** паведаміў, што гэтыя дакументы будуць падпісаны ў найбліжэйшы час. Таксама ён ацаніў месца Беларусі ў рэйтынгу Doing Business як пазітыўнае: «Некаторыя рэформы, якія былі праведзены, пакуль не ўвайшлі ў гэты рэйтынг. Спадзяемся, што ў наступным годзе яны ўвойдуць туды, і пазіцыя наша палепшыцца».

**Старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН** таксама спадзяецца на гэта. Толькі крыху больш асцярожна. Ён заўважыў, што рэйтынг Doing Business — адзін з 250, які не з'яўляецца самым важным для краіны. «Для нас больш важныя, напрыклад, індэксы эканамічнай свабоды, канкурэнтаздольнасці, сеткавай гатоўнасці, дзе мы, на жаль, знаходзімся на вельмі слабых пазіцыях. Але тым не менш у гэтым рэйтынгу мы за дзесяць гадоў добра прасунуліся. Мы паслядоўна знаходзім дыялог з уладай, прасоўваем нашу Нацыянальную платформу бізнесу і лічым, што здольныя на значна лепшыя вынікі. Мы хочам бачыць Беларусь на 10-м месцы. Для нашай краіны важны дзелавы клімат. Гэта дазволіць інвестарам прыйсці да нас і рэалізоўваць праекты», — адзначыў Уладзімір Карагін.

На яго думку, прыняцце дакументаў аб лібералізацыі бізнесу было запавалена. «Прэзідэнт даў заданне зрабіць гэта да сакавіка. Чыноўнікі і дзелавая супольнасць з гэтым не справіліся. Было шмат перагавораў і некалькі пытанняў, па якіх даводзілася доўга працаваць. Цэлым шэрагам дакументаў мы незадаволены. Асабліва ў падатковай сферы, ахове бізнесу. Трэба будзе яшчэ нямала дапрацоўваць. Наша дзелавая супольнасць, бізнес-асацыяцыі ў найбліжэйшы час сустрэнуцца з членамі ўрада. Мы яшчэ раз папрацуем па некалькіх пунктах. У нас ёсць пытанні да судовай сістэмы. Неабходна зніціць рызыкі вядзення бізнесу», — расказаў Уладзімір Карагін.

Па яго словах, сітуацыя для Беларусі ў сферы лібералізацыі бізнесу аптымістычная. «Калі мы ўсё зробім, то налета можам прасунуцца на 8—9 пунктаў у рэйтынгу. Пры гэтым не варта забываць, што ўсе краіны таксама паляпшаюць свой дзелавы клімат. У барацьбе за інвестара нам трэба паскорыцца», — рэзюмаваў Уладзімір Карагін.

У глабальным рэйтынгу краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для прадпрымальніцкай дзейнасці лідарам засталася Новая Зеландыя, на другім месцы — Сінгапур. За імі ідуць Данія, Рэспубліка Карэя, Ганконг (Кітай), ЗША, Вялікабрытанія, Нарвегія, Грузія і Швецыя. Сярод краін постсавецкай прасторы самае высокае месца займае Грузія — 9-е. Расія знаходзіцца на 35-м месцы, Казахстан — на 36-м.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Фінансы

# АБЯРЭГ АД МАРНАТРАЎСТВА

## Беларусы атрымалі першую бясплатную мабільную праграму для ўліку расходаў



**Айчынныя распрацоўшчыкі першымі стварылі аўтаматызаваны фінансавы памочнік PingFin, які дазваляе адсочваць выдаткі і атрымліваць скідкі ад магазінаў-партнёраў. Праграма PingFin бясплатная і ўжо даступная для запампоўкі ў Play Market. Аналагаў такой мабільнай праграмы няма не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.**

Па звестках даследчыкаў, сістэматычны ўлік выдаткаў дазваляе нават на першапачатковым этапе адмовіцца ад 30% імпульсных пакупак. Памочнік аўтаматычна ўлічвае і аналізуе расходы і даходы па ўсіх банкаўскіх картках.

— Вельмі важна заўсёды бачыць поўную карціну сваіх фінансаў і пры гэтым не марнаваць на аналітыку каштоўны час. Адна з галоўных пераваг, якую мы можам даць карыстальнікам PingFin — гэта аўтаматычны ўлік расходаў і даходаў. Сёння ў кашальках многіх беларусаў па 3—4 і больш картак. Нам удалося зрабіць праграму, якая дазваляе бачыць актуальныя балансы ўсіх картак на адным экране, разумець, колькі грошай у чалавека сваіх уласных, а колькі на крэдытках. Бо заўсёды вялікая спакуса выдаткаваць больш, чым трэба было б, — гаворыць **Юлія ЛАКАТКОВА, заснавальнік фінансавага праекта PingFin.**

Дамагчыся максімальнай аўтаматызацыі ўводу інфармацыі PingFin дазваляюць спецыяльныя алгарытмы, якія аналізуюць sms аб транзакцыях па картках банка. Гэта не толькі адзіна магчымы, але да таго ж самы бяспечны спосаб работы з такой інфармацыяй, як рух на банкаўскіх рахунках. Які бы дысцыплінаваным ні быў чалавек, у пытанні ўліку асабістых фінансаў не абысціся без аўтаматызаванага фінансавага памочніка. Інакш трэба захоўваць чэкі, пераносіць у смартфон інфармацыю з нататніка і пераэжываць, што вы нешта ўсё роўна забыліся. З PingFin дастаткова аплачваць свае пакупкі карткай любога банка, папярэдне падключыўшы да яе sms-апавяшчэнне, і ўся інфармацыя аб тым, дзе, колькі і на што вы патрацілі, будзе ў вас перад вачыма. Пакажыце некалькі разоў PingFin, да якой катэгорыі выдаткаў вы адносіце той ці іншы плацеж, ён навучыцца і пачне аўтаматычна адносіць вашы расходы да розных расходных артыкулаў.

Пры неабходнасці ў праграме можна стварыць «кашалёк» у любой валюце і запісаць у яго суму наяўных сродкаў, якія ёсць у вашым распараджэнні. Спецыяльныя алгарытмы PingFin выяўляюць асаблівасці ў плацежных паводзінах карыстальнікаў і падбіраюць для кожнага кліента індывідуальныя прапановы ад партнёраў праграмы.

Напрыклад, калі вы аматар азіяцкай кухні (а гэта фінансавы памочнік ведае, таму што вы часта ходзіце ў адпаведныя рэстараны), то вам абавязкова прапануюць 20-працэнтную зніжку на наведванне рэстарана сушы. Калі вы часта абедаеце па-за домам у раёне станцыі метро «Плошча Перамогі», то праграма дашле вам «падаруначак» ад кафэ, якое там знаходзіцца, — бясплатны амерыкана да ланчу, а аматары забаў, напрыклад, убачаць зніжку на канцэрты ад кампаніі ByCard.

Сёння партнёрамі PingFin ужо сталі ювелірныя салоны, фітнес-клубы, сеткі аптэк, страхавая кампанія, многія банкі. Колькасць персанальных прапаноў у праграмы імкліва расце.

Акрамя таго, праграма, вывучыўшы плацежныя паводзіны карыстальнікаў, таксама прапануе аформіць найбольш прыдатныя банкаўскія прадукты: картку для разлікаў за мяжой, картку, якая дасць магчымасць эканоміць людзям з вялікімі расходамі на асабістае аўто ці тым, хто шмат траціць на рэстараны....

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# АРЭНДА БЯРЭ ДРУГУЮ ХВАЛЮ?

## Попыт большы за прапанову

Рэаліі рынка такія, што танных прапаноў вельмі мала. Арандатары, якія засяліліся ў падобныя кватэры раней, імкнуцца іх утрымаць. Арэндадаўцы таксама зацікаўленыя ў тым, каб здаць у арэнду кватэру на больш працяглы тэрмін, асабліва калі іх задавальняюць кватаранты, якія своечасова аплачваюць жыллё. Колькасць новых бюджэтных прапаноў вельмі абмежаваная.

Маргарыта Пачыцкая кажа пра тое, што ў цяперашні час попыт на бюджэтныя кватэры ў Мінску перавышае прапанову. Відавочна адчуваецца дэфіцыт аднапакаёвых кватэр па цане 170—190 долараў. Гэта прыкладна тыя ж стаўкі, што былі і летам. Агенцтва адшукае вам маленькую кватэру за 160—180 долараў, але яна будзе абавязкова на першым паверсе старога дома, ды і ў не лепшым мікрараёне.

— Знайсці кватэру за гэтыя грошы можна. Іх вельмі мала, але ў нашай базе такія прапановы ёсць. Як правіла, гэта альбо жылое памяшканне «савецкага ўзору», альбо кватэра на ўскраіне горада. Вядома, падбіраючы бюджэтнае арэнднае жыллё, усё-ткі варта арыентавацца на 180—200 долараў, — удакладняе Маргарыта Пачыцкая.

На адну дагледжаную недарагую кватэру з нядрэнным месцазнаходжаннем можа прэтэндаваць нават 3—4 чалавекі. Асноўныя перавагі арандатараў — наяўнасць метро побач. Але гэты факт практычна не ўплывае на кошт арэнды. На першы план у перамовах выходзіць пытанне цаны. Адны арэндадаўцы таргуюцца, другія — не. Кожны выпадак індывідуальны.

Як правіла, акрамя арэнднай платы, усе кватаранты аплачваюць «камуналку». Калі ў жылым памяшканні ніхто не зарэгістраваны, гэты дадатковы плацеж у аднапакаёвай кватэры абыдзецца нават у 15—20 рублёў.

Наш эксперт адзначае, што цэны плацеж у аднапакаёвай кватэры абыдзецца нават у 15—20 рублёў.

## Двухпакаёўкі — ад 230 да 250 долараў

Зусім бюджэтны варыянт двухпакаёвай кватэры мае мінімальны цэннік, які пачынаецца з 200 долараў за месяц. Па такім кошце прапануюцца кватэры ўвогуле без рамонту або з мінімальным наборам старой мэблі і бытавой тэхнікі.

Сярэдні кошт арэнды стандартных двухпакаёвых кватэр, якія карыстаюцца стабільным попытам у кліентаў, складае ад 230 да 250 долараў. Цалкам укамплектаваныя і максімальна падрыхтаваныя для камфортнага жылля двухпакаёўкі, дзе прысутнічаюць усю сучасныя пральныя машыны і часам мікрахвалёўкі, здаюцца ў арэнду сёння ад 260 долараў. На рынку захоўваецца попыт і на трохпакаёвыя кватэры. «Разбежка» па цане паміж імі не такая і вялікая. Арэндныя стаўкі на трохпакаёвыя «хрушчоўкі» па кошце супастаўныя са стаўкамі на стандартныя «двухпакаёўкі». Сярэдні цэннік больш «упакаванай» трохпакаёвай кватэры складае ўжо 270 долараў. Як правіла, іх арандуюць па прынцыпе кампаньёнства студэнты альбо сем'і з дзецьмі.

Шматпакаёвыя кватэры чакаюць сваіх кватарантаў даўжэй, чым аднапакаёвыя. З дня падачы заяўкі ў агенцтва нерухомасці можа прайсці і месяц, пакуль кватэра знойдзе свайго арандатара.

## Перадаплата і праблема «шэрых» агентаў

Часам у сеціве сустракаюцца аб'явы, калі кліентам прапануюцца кватэры па кошце, які значна ніжэйшы за рынкавы. Няўжо і сапраўды нават сёння можна знайсці кватэру па стаўцы 150 і нават 140 долараў за месяц?

Справа ў тым, што за большасцю аб'яў з невысокімі цэнамі хаваюцца прапановы кампаній, якія аказваюць паслугі па перадаплаце. Схема работы такіх агенцтваў вядомая не першы год: з кліентам складаюць дамову на падбор варыянтаў, ён атрымлівае спіс кватэр з адрасамі, цэнамі і тэлефонамі гаспадароў, аплачвае паслугу ў касу і толькі пасля гэтага самастойна тэлефануе па гэтых варыянтах і ездзіць на прагляды. За актуальнасць аб'яў адказнасці ніхто не нясе. Сапраўды салідныя агенцтвы працуюць не па перадаплаце, а па факце. Гэты варыянт крышку даражэйшы, але дакладны.

Сёння на рынку прыватнай арэнды жылля існуе праблема, калі паслугі па пошуку варыянтаў кліенту прапануюць спецыялісты-адзіночкі, якія раней працавалі рыэлтарамі ў агенцтвах нерухомасці. У іх ёсць вопыт аналізу рознай спецыялізаванай інфармацыі з розных крыніц. Часам яны завабліваюць кліентаў «прымальнымі» цэнамі, якія на самай справе не адпавядаюць рэчаіснасці. Калі такі «шэры» агент не паказвае вам спецыяльную картку работніка вядомага вам агенцтва, то спажывец і не мае ніякіх гарантый таго, што атрымае якасную паслугу. Нагадаю, што ў легальным арэндным бізнесе кліенту абавязкова выдаецца дагавор і чэк. Без гэтых дакументаў чалавек увогуле не абаронены ад махлярства.

Спецыялістамі падлічана, што на другасным рынку арэнды жылля сталіцы доля здзелак па лініі «шэрых» агентаў складае каля 20%. Нелегальныя прадпрымальнікі ад арэнды часам могуць патрабаваць за свае паслугі значна меншыя грошы, але гарантый яны не даюць увогуле. Ёсць сярод іх і тыя, хто выдае сябе за агенцтва, якое працуе ў рамках закону. Таму перш, чым аддаць грошы і падпісаць дагавор, трэба ўпэўніцца, ці з тым агенцтвам планавалася супрацоўнічаць.

## Цэны стабілізуюцца

Эксперты рынку жыллёвай нерухомасці адзначаюць, што ў апошнія дні кастрычніка кліентаў на здымнае жыллё стала крыху больш. Аднак адразу гэты факт ніяк не паўплывае на агульныя тарыфы сталічнай прыватнай арэнды. Справа ў тым, што будучыя кватаранты проста не маюць магчымасці плаціць большыя грошы за арэнду. Апошнім часам заробкі нават у сярэдняга класа работнікаў у доларавым эквіваленце не павялічыліся. Спецыялісты ўпэўнены, што сітуацыя са стаўкамі арэнды застанецца стабільнай да пачатку наступнага года.

Змяненне цэннікаў (у бок павелічэння) можа адбыцца толькі пры выкананні некалькіх умоў. Па-першае, свабодных кватэр на рынку стане менш, чым летась. Другім фактарам можа стаць павелічэнне сур'ёзнага попыту не толькі з боку студэнтаў, а таксама маладых спецыялістаў і маладых сем'яў.

Разам з тым эксперты адзначаюць, што падаражанне здымных кватэр можа і не быць. Сёння на гэтым рынку не існуе нейкіх сур'ёзных эканамічных прычын, каб цэннік на падобны тавар увогуле рос. Павелічэнне можа мець ажыятажную прычыну, калі кліентам будзе здавацца, што кватэр усім не хопіць. Аднак падобнае падаражанне звычайна мае толькі часовы характар.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Меркаванне

# «КАЛІ МЫ ДУМАЕМ ПРА НАРОД І РАДЗІМУ, ТО НЕЛЬГА АДЫСЦІ Ў ЦЯЖКІ МОМАНТ УБОК»

## Гісторык пра тое, як беларусам ставіцца да рэвалюцыі і постаці яе правадыра

**Кастрычніцкая рэвалюцыя — адна з найважнейшых палітычных падзей не толькі для Расіі, але і для ўсяго свету, бо ход гісторыі пасля гэтага быў беспаваротна зменены. Меркаванні аб гэтым у беларусаў розныя. Наш карэспандэнт пагутарыў з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дырэктарам Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вячаславам ДАНІЛОВІЧАМ пра тое, як правільна ўспрымаць рэвалюцыю, што было б з Расіяй без кастрычніцкага перавароту, а таксама пра тое, што значылі падзеі 100-гадовай даўнасці для Беларусі.**



### ПЕРАМОГІ І ПАРАЖЭННІ

***— Чаму ў Расіі адбылася рэвалюцыя?***

— Рэвалюцыйныя падзеі 1917 года маюць пад сабой цэлы комплекс прычын. Сітуацыя склалася такім чынам — і геапалітычная, і ўнутрыпалітычная, і сацыяльна-эканамічная, — што фактычна рэвалюцыя атрымала магчымасць здзейсніцца. Якія гэта прычыны? Самая галоўная — і я ў гэтым глыбока перакананы — слабасць расійскай цэнтральнай улады. Відавочна, што палітыка царскага ўрада не ўлічвала інтарэсы асноўных пластоў грамадства. Да таго ж, калі пачаліся рэвалюцыйныя выступленні ў Петраградзе, то іх можна было б спыніць, не даць ім пашырыцца, калі б на тое была палітычная воля і рашучасць. А гэта, як мы ведаем, не было зроблена, што пацвярджае тэзіс аб нездольнасці царскіх улад захаваць парадак і кіраванасць краіны.

***— Ці можна казаць, што Мікалай II быў нерашучым, некампетэнтным і слабым кіраўніком?***

— Факт застаецца фактам — рашучых дзеянняў з боку ўлады не было. Што датычыцца кампетэнтнасці, то тут трэба вывучаць пэўныя дакументы. Я думаю, кампетэнтнасць прысутнічала, але не хапіла здольнасці забяспечыць выкананне неабходных захадаў дзеля захавання дзяржавы. У выніку рэвалюцыйныя падзеі засведчылі тое, што Мікалай II быў слабым кіраўніком. Не хапала волі апошняму расійскаму імператару.

***— У якой меры гаворка ідзе аб «імпартным праекце»?***

— Яшчэ раз падкрэслю, што рэвалюцыя — гэта спалучэнне комплексу прычын. Таму, вядома, былі знешнія сілы, якія былі зацікаўлены ў аслабленні Расійскай імперыі. У гэтым кірунку працавалі замежныя разведкі. Але калі б унутрыпалітычная сітуацыя не склалася пэўным чынам, то знешнім сілам было б цяжка здзейсніць такое. Усё наклалася адно на адно.

***— Хто выйграў, а хто прайграў ад гэтай рэвалюцыі?***

— Тут я вымушаны сказаць, што, на мой погляд, любая рэвалюцыя — гэта анамальная з'ява ў развіцці грамадства. І калі яна здараецца, то адбываецца злом старога дзяржаўнага апарату, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных адносін. Зразумела, што краіна ў любым выпадку на пачатковым этапе адкідваецца ў сваім развіцці назад. Гэта мы і ўбачылі ў выніку рэвалюцыйных падзей 1917 года. Таму, з аднаго боку, выйгралі геапалітычныя праціўнікі Расіі, выйграла партыя бальшавікоў, якая прыйшла да ўлады. З другога боку, гэта безумоўны пройгрыш старой расійскай палітычный эліты. Да таго ж, першапачатковы злом, рэалізацыя палітыкі ваеннага камунізму, тэрор прывялі да вялікіх узрушэнняў у грамадстве і шматлікіх чалавечых ахвяр. Тым не менш, урэшце пры ўсіх тых хібах і ўзрушэннях, сацыяльны аспект у далейшым развіцці савецкай краіны захаваўся. Была здзейснена ў значнай ступені паспяховая спроба пабудовы сацыяльна арыентаванага грамадства. Вядома, на жаль, гэта было зроблена праз кроў, але фактам застаецца і тое, што ў савецкі перыяд былі велізарныя дасягненні.

### ЧАКАННІ І РЭАЛЬНАСЦЬ

***— Як маглі б развівацца падзеі ў свеце, калі б рэвалюцыя ў Расіі не здарылася?***

— Гісторыя не разважае, што магло б быць, яна грунтуецца на фактах. Усё астатняе — гэта толькі гіпотэзы і прагнозы. Зразумела, што гісторыя магла пайсці па іншым напрамку. Магчыма, захавалася б Расійская імперыя, потым яна б трансфармавалася, як Брытанская, напрыклад у нейкі саюз. Можа, і было б менш ахвяр, з другога боку, гэтага не ведае ніхто. У любым выпадку, калі б захоўвалася моцная краіна, то былі б і геапалітычныя сапернікі, якія былі зацікаўлены ў яе паслабленні. Ваенныя дзеянні і без рэвалюцыі маглі б адбыцца паміж буйнымі гульцамі.

***— Калі б перанесліся на сто гадоў таму, то на чый бок вы б сталі?***

— Я рабіў бы ўсё магчымае, каб рэалізавалася ідэя беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, таму што рэвалюцыйныя падзеі падштурхнулі да гэтага. Першая такая спроба адбылася менавіта пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Першы Усебеларускі з'езд быў прафінансаваны партыяй бальшавікоў, такі крок быў зроблены. Таму ў тых абставінах, улічваючы маю сучасную пазіцыю, я б далучыўся да гэтых людзей. Не, я б не сеў у параход і не адплыў. Калі чалавек не патрыёт сваёй краіны, для яго галоўнае — захаваць сябе і сваіх блізкіх, тады алгарытм зразумелы. Але калі мы думаем пра народ і Радзіму, то нельга адысці ў цяжкі момант убок.

***— Як бы ў СССР адзначылі стагоддзе Кастрычніцкай рэвалюцыі?***

— Мне падаецца, што гэта свята мела б не столькі рэвалюцыйны змест, колькі сацыяльны. Былі б і дэманстрацыі, і навуковыя форумы. Магчыма, гэта свята набыло б такі змест, як сёння ў нашай краіне, калі да 7 лістапада адкрываюцца станцыі метро, сацыяльныя і культурныя аб'екты. Гэта нармальная гістарычная трансфармацыя, калі разбуральны складнік пастуова адыходзіць і на першы план выходзіць ствральны сацыяльны аспект. Я лічу, што ў СССР так бы і было.

### АЙЧЫННАЯ ПАЗІЦЫЯ

***— Якая роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гісторыі станаўлення Беларусі? Як зараз успрымаць тыя падзеі?***

— Яна вельмі моцна паўплывала на гісторыю Беларусі, таму што, як я ўжо казаў, упершыню паспрабавалі рэалізаваць ідэю беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Гэта вельмі важны момант для нашай краіны. Гэта ўжо было не поліэтнічнае ўтварэнне, а на першае месца выйшаў нацыянальны беларускі складнік. Як успрымаць рэвалюцыйныя падзеі? У гісторыі вельмі мала такіх з'яў, якія можна характарызаваць як адназначна добрыя ці дрэнныя. У рэвалюцыі 1917 года ёсць і адмоўныя, і станоўчыя бакі. Але магу сказаць, што ў далёкім выніку тагачасных падзей з'явілася незалежная Рэспубліка Беларусь, і сёння мы можам ісці ўласным шляхам развіцця, кіруючыся інтарэсамі менавіта свайго народа і дзяржавы. А што далей? Сусветная практыка паказвае, што адной краіне цяжка адстойваць свае інтарэсы, трэба дзейнічаць у саюзе. Таму я лічу правільнай і цалкам абгрунтаванай палітыку па ўмацаванні Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС.

***— Як, на ваш погляд, правільна ў сучасных рэаліях ставіцца да постаці Уладзіміра Леніна?***

— Розныя могуць быць стаўленні. З пункту гледжання Беларусі нам не трэба забываць тое, што Ленін абвясціў права нацый на самавызначэнне. Дзякуючы яго пазіцыі была абвешчана БССР, на практыцы рэалізавалася беларуская нацыянальная дзяржаўнасць. Аб гэтым трэба памятаць, таму што невядома, калі б мы атрымалі незалежнасць без рэвалюцыйных падзей. Так, пры ім тэрыторыя Беларусі была падзелена, але потым бальшавікі ліквідавалі гэту гістарычную несправядлівасць.

***— Ксенія Сабчак заявіла, што ў выпадку перамогі на прэзідэнцкіх выбарах Расіі, яна б прыбрала цела Леніна з Краснай плошчы. Як думаеце, час прыйшоў?***

— Гэта павінны вырашаць расіяне і кіраўніцтва Расіі. Можа, варта было б гэта зрабіць, можа, ёсць і іншыя палітычныя меркаванні. У славянскай жа традыцыі практыка пахавання ў маўзалеях не была распаўсюджана. Вядома, большасць краін сапраўды сёння сталі на капіталістычны шлях, але капіталізм ужо не той, што раней. Многія сацыялістычныя ідэі яшчэ жывуць і выкарыстоўваюцца тымі ж самымі сацыял-дэмакратамі, напрыклад у Швецыі. З другога боку, ёсць і прыклад КНР. Магчымае пахаванне Леніна не стане канцом гэтых ідэй.

***— Якія міфы аб Кастрычніцкай рэвалюцыі шчыльна заселі ў галовах беларусаў?***

— Некаторыя беларусы ўспрымаюць тыя падзеі як толькі адмоўныя, адназначна негатыўна ставяцца да Леніна. Мы, вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кіруемся прынцыпам аб'ектыўнасці і разглядаем гістарычныя падзеі з пункту гледжання беларускага народа. Калі выкарыстоўваць такі падыход, то міфаў будзе менш. У Год навукі асабліва хочацца звярнуць на гэта ўвагу нашага грамадства. Дарэчы, літаральна другога-трэцяга лістапада мы правялі грунтоўную міжнародную навуковую канферэнцыю «Вялікі кастрычнік у гістарычным лёсе беларускай дзяржаўнасці», якая якраз і была накіравана на пазбаўленне ад гістарычных міфаў аб рэвалюцыйных падзеях і пашырэнне аб'ектыўных навуковых поглядаў.

***— Як рэвалюцыя адбілася на жыцці вашых продкаў?***

— Па лініі маці яны паходзяць з Заходняй Беларусі, таму на іх усё адбілася пазней. Па бацькоўскай лініі на момант здзяйснення рэвалюцыі і мой прадзед, і прабабуля жылі ў весцы, былі небагатымі сераднякамі. Пасля ж смерці прадзеда мой дзед вымушаны быў пайсці працаваць да заможных аднавяскоўцаў. Дзякуючы сацыяльным зменам, якія адбыліся ў выніку рэвалюцыі, ён атрымаў адукацыю, працоўную кваліфікацыю. Таму ў Вялікую Айчынную вайну змагаўся за савецкую краіну. Безумоўна, жыццё маіх продкаў не было лёгкім і простым, але адмоўнага стаўлення да савецкай улады нават з боку сваякоў з Заходняй Беларусі не было. Яны былі задаволены сваім жыццём.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■ Класныя навіны

# Беларуская літаратура + сацыяльныя сеткі

## Стартаваў новы этап сацыяльнага праекта «Чытаем па-беларуску з Velcom»

**Раней ініцыятыва існавала ў выглядзе інтэрактыўных урокаў беларускай мовы і літаратуры, настаўнікамі на якіх выступалі вядомыя беларускія пісьменнікі, паэты, акцёры, тэлевядучыя і спартсмены. Цяпер «Чытаем па-беларуску з Velcom» запускаецца ў фармаце рэспубліканскага анлайн-конкурсу, удзельнікамі якога стануць вучні 7—8 класаў з усёй Беларусі.**

Мэта праекта — адкрыць для вучняў свет беларускай літаратуры па-новаму, а таксама выкарыстаць для адукацыі магчымасці сацыяльных сетак. Вучням трэба запісаць відэа, дзе яны чытаюць твор са школьнай праграмы па беларускай літаратуры. Гэта можа быць як паэзія, так і проза. Затым трэба выкласці яго на асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы («УКантакце», Facebook ці Instagram) з хэштэгам #чытаемзвэлком або #чытаемзvelcom, а таксама адправіць спасылку на публікацыю на афіцыйны адрас конкурсу — movakonkurs@gmail.com. Відэазапісы ўдзельнікаў прымаюцца да 30 лістапада 2017 года.

На першым этапе праекта вызначацца па 30 наймацнейшых заявак з кожнай вобласці і з Мінска. З лютага па красавік 2018 года будуць праходзіць рэгіянальныя фіналы, дзе чытальнікі выступяць перад журы ўжывую. Пяцёра лепшых ад кожнага рэгіёна будуць узнагароджаны сучаснымі смартфонамі і атрымаюць магчымасць пазмагацца ў рэспубліканскім фінале. Ён пройдзе ў Мінску ў маі 2018 года. Пераможцам конкурсу будуць уручаны смартфоны.

— За першыя два гады рэалізацыі праекта «Чытаем па-беларуску з Velcom» наша каманда праехала 21 000 кіламетраў і правяла ўрокі ў 184 школах і гімназіях у 40 населеных пунктах. Сёння мы рады распачаць новы этап праекта, які дазволіць ахапіць кожную школу Беларусі, пракаментаваў падзею **начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый Velcom Вячаслаў СМІРНОЎ.** — І калі першы этап быў адрасаваны вучням малодшых класаў, то цяпер мы арыентуемся на вучняў 7—8 класаў. Новы фармат конкурсу дыктуе сам час, бо падлеткам цяпер звыклыя смартфоны і сацыяльныя сеткі. Наша мэта — выкарыстаць сучасныя тэхналогіі, каб звярнуць увагу на прыгажосць беларускага слова, велізарны і разнастайны пласт выдатных твораў нашых аўтараў.

Падчас прэзентацыі новага этапу, якая прайшла ў сталічнай сярэдняй школе №136, вучням, гасцям і журналістам падрабязна расказалі аб правілах удзелу ў праекце. Першымі будучых удзельнікаў конкурсу падтрымалі прадстаўнікі ад Беларусі на дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне» ў 2015 і 2017 гадах — Руслан Асланаў і Хелена Мерааі. Ініцыятарам праекта выступіла кампанія Velcom пры падтрымцы Міністэрства адукацыі нашай краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Извещение о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений(зданий, сооружений) в г. Бресте

| Предмет аукциона | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) | |
|---|---|---|
| | **лот №1** | **лот №2** |
| | в районе пересечения ул. Речицкой и ул. Писателя Смирнова г. Бреста, на земельном участке площадью 0,4465 га | по ул. Лейтенанта Рябцева, 12 на земельном участке площадью 1,3030 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | право проектирования и строительства объекта торговли | право проектирования и строительства объекта административно-торгового назначения (за исключением продовольственной группы товаров) |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком на 5 лет** | **в аренду сроком на 5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | объекты недвижимости граждан Республики Беларусь | объекты недвижимости КУП «ЖРЭУ г. Бреста», ООО «Анигос» ПРУП «Брестоблгаз» |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой** | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **58 896,34** | **190 094,34** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 11 710,00 | 38 000,00 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)** | **5 887,77** | **8 482,80** |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям, (руб.)** | **931 514,00** *(на 15.08.2017 г.)* | **90 416,07** *(на 23.05.2017 г.)* |
| **Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** | | |
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462 | **2 300,00 рублей** | |

**Условия продажи:**

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона в аренду сроком на 5 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

– в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;

– в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий два года, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;

– при проектировании и строительстве объекта будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;

– в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;

– в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта, а также возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которой определяется до аукциона и фиксируется в соответствующей ведомости ознакомления участников);

– до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

– заключить договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений после совершения оплаты соответствующих сумм, но не позднее двух рабочих дней;

– в течение шести месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления.

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

**Аукцион состоится 7 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 04.11.2017 г. до 17.30 01.12.2017 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже имущества, обращенного в доход государства по Брестской области

| № лота | Наименование объекта/ характеристика объекта | Местонахождение объекта/ кадастровый номер участка | Начальная цена продажи, руб. до проведения уценки | Начальная цена продажи, руб. после проведения уценки на 10% | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **1*** | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-18587, площадью – 494,9 кв. м (назначение: **Административное помещение**, наименование: Изолированное помещение корпуса №8), находящееся в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-5728, расположенном на земельном участке площадью 0,3396 га. Брестская область, г. Брест, ул. Московская, 202. Год постройки 1969 | 140100000001015340 г. Брест, ул. Московская, 202. | **301 320,00** | **271 188,00** | 27 100,00 |

***повторные аукционные торги после проведения уценки на 10%**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**
**Контактные телефоны: 53-81-92, 53-45-65. http:// bgcn.by; gki.gov.by; dha.gov.by**

**Аукцион состоится <u>23 ноября 2017 г.</u> в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607 (либо актовый зал)**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 04.11.2017 г. до 17.30 17.11.2017 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50**

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».

**При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, предоставляет:**

– копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

– документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица, и его паспорт;

– паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица;

– заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающие внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта;

– организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе);

– организациями и физическим лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на бел. (рус.) язык;

– представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код AKBBBY21100, УНП 290433924.**

<u>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:</u>

– **в течение 3 рабочих дней** со дня проведения аукциона оплатить сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

– **не позднее 20 рабочих дней** со дня подписания протокола о результатах аукциона оплатить стоимость приобретенного на аукционе объекта недвижимого имущества. Победитель аукциона приобретает право собственности на недвижимое имущество в соответствии с законодательством.

**Земельный участок, на котором размещается недвижимое имущество, предоставляется победителю аукциона без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды земельного участка при его предоставлении в аренду.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует**

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже **производственной базы**, расположенной по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 и принадлежащей ОАО «Белпромтара», опубликованном в газете «Звязда» от 19.10.2017, вносятся изменения: «**Аукцион состоится, читать: 14.11.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-й этаж, актовый зал**.»

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: **auction@cpo.by**. Сайт: **www.cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению **ОАО «ПМК–72»** (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **столовой, общ. пл. 288,9 кв. м с инв.** №614/С-44118, расположенной на земельном участке **пл. 0,2297 га** (право постоянного пользования) с кадастровым номером 624850100002001310 по адресу: Минская область, **г. Смолевичи, ул. Коммунистическая, 6.**

**Начальная цена объекта с НДС (20%) – 106 077,60 бел. руб.** Задаток 10% от начальной цены (10 607,00 бел. руб.).

**ГУ «Объединение Минскмелиоводхоз» совместно с продавцом установлены условия продажи объекта:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– приступить к разработке проектно-сметной документации, проведению проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Задаток 10% от начальной цены (10 607,00 бел. руб.) перечисляется на р/с №BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.</u> Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **05.12.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.12.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Ветковский КБО» (продавец) извещает о проведении <u>16 ноября 2017 года</u> открытого повторного аукциона по продаже имущества <u>в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20</u>**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, без НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. №311/D-8394**, площадью **1 139,4 кв. м,** назначение – коммунально-бытовое помещение, наименование – **помещение**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Ленина, 2.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **320850100017000008** площадью **0,1816 га (право постоянного пользования).** | **95 095,00** | 4 754,75 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. №311/D-10965**, площадью **444,0 кв. м,** назначение – помещение бытового обслуживания населения, наименование – **помещение КБО**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Луначарского, 22/1.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **320850100019000061** площадью **1,3863 га (право постоянного пользования).** | **20 040,00** | 1 002,00 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. №311/D-8912**, площадью **227,6 кв. м,** назначение – магазин, наименование – **магазин**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ветковский р-н, Приснянский с/с, д. Присно, ул. Советская, 2.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **320884001601000149** площадью **0,1054 га (право постоянного пользования, 43/100 доли).** | **16 775,00** | 838,75 |

**<u>Продавец:</u>** ОАО «Ветковский КБО», г. Ветка, ул. Ленина, 2. Конт. тел. 8 (029) 690-00-10 – Беланов Руслан Николаевич (ликвидатор предприятия). **<u>Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. ПРИМЕЧАНИЕ: Реализация имущества осуществляется без у НДС. Для участия в аукционе необходимо:</u> 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **<u>Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга»):</u>** р/с BY34 BAPB 3012 2093 7001 3000 0000 Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, БИК BAPBBY23912, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);.

**2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 ноября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 14 ноября 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **<u>5 (пять) %</u>**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **<u>10 (десяти)</u> календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **<u>3 (трех) рабочих дней</u>** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 №607). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 13.06.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

# ВА ЎСІМ ВІНАВАТЫЯ... ЖАНЧЫНЫ?

## Слабае звяно

Прырода распарадзілася так, што самцы... не надта жыццеўстойлівыя. Хоць спачатку на 100 жаночых эмбрыёнаў прыпадае аж но 160 мужчынскіх. На этапе з'яўлення на свет на 100 дзяўчынак — ужо 106 хлопчыкаў. Ну і чым далей, тым усё больш відавочны гэты колькасны разрыў.

Паводле слоў **дацэнта кафедры ўралогіі і нефралогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдата медыцынскіх навук Мікалая ДОСТЫ,** мужчыны значна больш падвяргаюцца самым розным шкодным уздзеянням. Яны працуюць на шкодных вытворчасці, менш стрэсаўстойлівыя, акрамя таго, сярод іх больш распаўсюджаны шкодныя звычкі. Першымі на праблему звярнулі ўвагу ў ЗША — гадоў дваццаць назад, калі было вырашана стварыць Сусветную асацыяцыю мужчынскага здароўя. Не так даўно нарадзілася такая асацыяцыя і ў Расіі. У свеце існуе «ажно» два інстытуты мужчынскага здароўя — у ЗША і Аўстрыі. У нас гэту тэму на нацыянальным узроўні паднялі летась. Зайшла размова пра стварэнне кабінета мужчынскага здароўя. Праўда, яго асноўнай мэтай павінна стаць абследаванне мужчын рэпрадуктыўнага ўзросту, каб у першую чаргу дапамагчы бясплодным.

Але ж тэма мужчынскага здароўя наўрад ці абмяжоўваецца толькі здольнасцю да зачацця. Бясплоднасць — гэта толькі адна з велізарнай колькасці праблем са здароўем у сучаснага мужчыны. Нездароўе моцнага полу абумоўлена ў першую чаргу сардэчна-сасудзістымі, анкалагічнымі, эндакрыннымі, уралагічнымі ды іншымі паталогіямі. Да пары да часу абсалютная большасць пра ўвесь свой букет захворванняў нават не здагадваецца. Моцны пол, аказваецца, вельмі інертны. Па некаторых замежных даных, толькі 37 працэнтаў звяртаюцца па ўрачэбную дапамогу пры з'яўленні нейкіх расстройстваў. Толькі 10 працэнтаў з гэтай колькасці прымаюць прызначанае лячэнне. Што ўжо гаварыць аб аглядах прафілактычных...

## Ведаў — нуль

Агульная дасведчанасць нашых мужчын аб сваім здароўі і здароўі наогул — дзесьці на ўзроўні трэцяга класа. Паводле апытанняў, палова не ведае, дзе знаходзіцца прастата і для чаго яна наогул патрэбна. Усяго 25 працэнтаў ведае, хто такі андролаг. Дарэчы, гэта ў першую чаргу, уролаг, які спецыялізаваўся па сексалогіі, рэпрадуктыўнай эндакрыналогіі, экстракарпаральным апладненні і некаторых іншых пытаннях. Такія спецыялісты ў Беларусі ёсць, іх няшмат, але ў большасці выпадкаў дастаткова і ўролага, які займаецца захворваннямі органаў мочапалавой сістэмы ў мужчын (і мачавой — у жанчын). Урологі ў нашай краіне сёння больш даступныя. І тым не менш многія мужчыны вельмі позна знаходзяць да іх дарогу — бадай, толькі калі моцна прыцісне. А трэба было б рэгулярна наведвацца пачынаючы з 18—29 гадоў, калі можна выявіць першыя прыкметы будучых непрыемнасцяў. Спецыялісты бачаць у гэтым вялікую праблему.

Вось з жанчынамі сітуацыя іншая. Па меры таго, як падрастае дзяўчынка, яна пераходзіць ад педыятра да гінеколага. Цяжарнасць, роды, хваробы дзіцяці — пастаянна даводзіцца сустракацца з белымі халатамі. Сярэднестатыстычная жанчына звяртаецца па ўрачэбную дапамогу ў 100 разоў часцей за мужчыну!

## Не лепшая спадчына

Нейкага канкрэтнага крытэрыя мужчынскага здароўя не існуе, бо як абазначыць адной лічбай стан камфорту — фізічнага, псіхічнага, сацыяльнага? Відавочна, што галоўнай прычынай смяротнасці з'яўляюцца не эрэктыльныя дысфункцыі. Але ж уралагічныя праблемы часта абумоўлены наяўнасцю... эндакрынных парушэнняў. На жаль, нават не ўсе ўрачы разумеюць гэтую сувязь, калі пачынаюць лячыць прастату да абследавання ў эндакрынолага. З узростам у мужчын трэба падазраваць і выяўляць так званы метабалічны сіндром, захворванні шчытападобнай залозы. Што на рэзкае павелічэнне рызыкі цукровага дыябету 2 тыпу пры ўжыванні прадуктаў, багатых на транс-тлушчы (мяккія маргарыны, спрэды, кулінарныя тлушчы і інш.). А паводле аднаго брытанскага даследавання, у Беларусі канцэнтрацыя транс-тлушчаў у прадуктах харчавання вельмі высокая. Якім чынам было праведзена само даследаванне, сказаць цяжка, аднак паразважаць ёсць над чым.

## Літраў пяць?

Якасць здароўя кожнага наступнага пакалення мужчын — гэта паводзіны ў маладыя гады яго папярэднікаў. Менавіта ў маладосці закладваюцца ў генетычны матэрыял набытыя паломкі і парушэнні, якія будуць перадавацца наступным пакаленням. Але хто пра гэта думае?.. Ці ведаюць мужчыны, што для рэпрадуктыўнага здароўя мець высокі ўзровень тэстастэрону няблага, аднак такія мужчыны заўсёды схільныя да



да таго ж метабалічнага сіндрому, то пазбегнуць парушэння абмену рэчываў і артэрыяльнай гіпертэнзіі можна толькі з дапамогай адпаведнага ладу жыцця. Вага, акружнасць таліі, артэрыяльны ціск, халестэрын і ўзровень глюкозы павінны быць у норме. А яшчэ добра мець... ідэальную генетыку.

— Вельмі многае, як высвятляецца, закладваецца ў генетычны матэрыял будучага дзіцяці падчас цяжарнасці і перадаецца наступным пакаленням. На здароўе будучага мужчыны ўплывае стан здароўя яго мамы, а яшчэ вельмі шмат фактараў навакольнага асяроддзя, якія ўздзейнічалі на яе падчас цяжарнасці. Пестыцыды, гербіцыды, пластык, дамашняя хімія — чым менш, тым лепш, — заўважае **загадчыца кафедры эндакрыналогіі БелМАПА, доктар медыцынскіх навук, прафесар Ларыса ДАНІЛАВА.** — Важны момант — харчаванне ў розныя трыместры цяжарнасці. Галандцы даследавалі здароўе дзяцей, чые маці галадалі падчас Другой сусветнай вайны. Аказалася, галаданне ў першыя трыместры закладвае паломкі, якія потым абарочваюцца лішняй вагой, атлусценнем і цукровым дыябетам 2 тыпу. Нам пакуль цяжка нават усвядоміць, наколькі арганізм чалавека і навакольны свет узаемазвязаны — усё нашмат больш складана, чым здавалася...

Што да харчавання, то эндакрынолагі ўсім нам указваюць агрэсіўных і рызыкоўных паводзінаў, што прыводзіць і да ранняй смяротнасці. Такіх проста цягне пакаштаваць усё, што не варта. Напрыклад, алкаголь.

— У нас смяротнасць мужчын у рэпрадуктыўным узросце звязана з ужываннем і злоўжываннем алкаголем, — кажа **намеснік дырэктара па медыцынскай часці Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Сяргей ОСІПЧЫК.** — Да нас на абследаванне накіроўваюць прызыўнікоў. У аднаго з іх я спытаў пра занятак у вольны час. Хлопец сказаў, што яны сядзяць з сябрамі, п'юць піва, і асабіста ён здольны выпіць за вечар... літраў пяць... Не думаю, што ў нас можна гаварыць аб недаступнасці меддапамогі. Звычайна мае месца нізкая дасведчанасць аб нейкіх важных рэчах. Неабходна фарміраваць адэкватныя паводзіны ў маладых мужчын.

## Гармон у дэфіцыце

Колькасць мужчынскага палавога гармону тэстастэрону зніжаецца пасля 35 гадоў на 1,5 працэнта штогод. Гэта спрыяе развіццю ўралагічнай паталогіі ў мужчын пасля 40. Пік захваральнасці прыпадае на 52—56 гадоў. Дарэчы, за апошнія дзесяцігоддзе ўралагічная захваральнасць у структуры агульнай вырасла прыкладна ўдвая — і не за кошт інфекцый, а за кошт захворванняў прастаты і мочакаменнай хваробы.

Калі ўзяць мужчын 35, 45 і 55 гадоў, то з кожным дзесяцігоддзем будзе адзначацца ўсё больш выпадкаў спалучэння зніжэння ўзроўню тэстастэрону, вісцэральнага атлусцення (калі мяняюцца суадносіны тлушчавай і мышачнай тканкі, прычым гэта можа быць не такім ужо відавочным чыста знешне — навакольныя не скажуць, што ў гэтага мужчыны ёсць атлусценне) і метабалічнага сіндрому. Усё гэта і ёсць праявы ўзроставага андрагеннага дэфіцыту, які цягне за сабой дабраякасную гіперплазію прастаты, рак прастаты, сімптомы парушанага мочаспускання, мочакаменную хваробу, рак ныркі, хранічныя захворванні нырак, рак мачавога пузыра, сексуальную дысфункцыю, мужчынскую бясплоднасць. Адным словам, 90 працэнтаў уралагічных праблем.

## Ёсць варыянты

Дваццаць гадоў таму захваральнасць на рак прастаты была ў нас адной з самых нізкіх у Еўропе, а смяротнасць адна з самых высокіх, яна прырастала штогод на 10 працэнтаў. У 2000 годзе ад раку прастаты памерла 1 тысяча мужчын, і далей плюс 100 кожны год. У 2007 годзе ў нас, нарэшце, пачалі займацца скрынінгам прастаты, хоць для ўрачоў гэта відавочная дадатковая нагрузка. Хоць бы таму, што давялося поўнасцю памяняць сістэму падыходу да дыягностыкі. А для Міністэрства аховы здароўя — гэта яшчэ і дадатковыя расходы. Пацыентам жа скрынінг наогул не патрэбны. Паспрабуйце пераканаць мужчыну, які «нічога не адчувае», у неабходнасці здачы аналізаў.

Урэшце дзякуючы жорсткім адміністрацыйным мерам удалося ў некалькіх раёнах укараніць гэту практыку. І толькі калі былі атрыманы пэўны вынік, практыку пашырылі на ўсю краіну. Паказчыкі захваральнасці выраслі ў 7 разоў, але на працягу апошніх 5 гадоў Беларусь мае зніжэнне смяротнасці ад раку прастаты на 2 працэнты ў год. Скрынінгам ахоплена 250 тысяч мужчын. Калі ўдасца ахапіць 800 тысяч, смяротнасць знізіцца яшчэ больш.

Здароўе мае на ўвазе не столькі адсутнасць захворванняў, колькі дабрабыт ва ўсіх сэнсах, якасць жыцця. Пра гэта клапоцяцца і анколагі.

— Перад такімі аперацыямі, як прастатэктамія (якія выклікаюць імпатэнцыю), я пытаюся ў пацыентаў, што яны выбіраюць: працяглае жыццё з імпатэнцыяй і частковым нетрыманнем мачы або менш працяглае і з нармальнай патэнцыяй? На маёй памяці толькі адзін чалавек (і тое гэта быў жыхар Арменіі) выбраў другі варыянт, — заўважае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сяргей КРАСНЫ.** — Але калі ты памёр, то ўжо не мае значэння, з якой патэнцыяй...

Якасць жыцця — гэта яшчэ і пра ранняе выяўленне любых захворванняў. А для гэтага ў нашых мужчын павінна з'явіцца патрэба ў своечасовых абследаваннях, адпаведным ладзе жыцця, бо ніякая суперсучасная медыцына не ратуе таго, хто сам сябе не ратуе.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

protas@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ■ На слыху

### Каб рыбалка была «ў кайф»?

**Трох мінчан затрымалі дзяржінспектары ў Маладзечанскім раёне на вадаёме каля вёскі Ізабеліна. Два з іх, экіпіраваныя для падводнага палявання, ноччу займаліся здабычай рыбы пры дапамозе асвятляльных прыбораў, што правіламі забаронена.**

Не было ў рыбакоў і адпаведных дакументаў. Паколькі налавіць шмат рыбы парушальнікі не паспелі, у адносінах да іх былі складзены адміністрацыйныя пратаколы.

Трэці ж таварыш, які чакаў рыбакоў на беразе, цішком выцягнуў з аўтамабіля два пакеты і, кінуўшы іх на зямлю, паспрабаваў нагой запіхнуць пад днішча аўто. Ён выкінуў у траву і невялікі скрутачак з фольгі. Інспектары знайшлі выкінутыя прадметы. У пакетах было рэчыва расліннага паходжання, як меркавалася, марыхуана. Скрутак з фольгі быў падобны на прыстасаванне для курэння. Экспертыза здагадку пацвердзіла: у пакетах сапраўды была марыхуана вагой 26 грамаў. Прызначаны таксама экспертызы скрутачка і змываў з рук падазраванага. За незаконнае захаванне наркотыку мінчаніну пагражае абмежаванне волі на тэрмін да пяці гадоў ці пазбаўленне волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

У Дзяржінспекцыі нагадалі, што гэта не адзіны выпадак, калі дзяржінспектары выяўляюць небяспечныя наркотыкі. У жніўні—верасні супрацоўнікі Гомельскай абласной інспекцыі падчас палявых кантрольных мерапрыемстваў знайшлі два месцы з каноплямі — поле каля гектара ў Буда-Кашалёўскім раёне і 0,3 гектара ў Гомельскім раёне. Небяспечная раслінасць была знішчана міліцыянерамі.

### Дадому — на ўкрадзеным аўто

**За крадзеж аўтамабіля супрацоўнікі крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 19-гадовага беспрацоўнага жыхара Мінска.**

Малады чалавек вяртаўся дадому. У завулку Казлова яму кінуўся ў вочы аўтамабіль «ВАЗ 2101». Разбіўшы бакавое шкло, ён пранік у салон і паспрабаваў пры дапамозе праводоў завесці машыну, але не змог. Пасля гэтага зняў магнітолу і накіраваўся з ёй дадому. Але на шляху на вуліцы Уральскай яго ўвагу прыцягнула яшчэ адна машына — «Жыгулі». Гэтая спроба згону стала ўдалай. Адчыніўшы дзверы адвёрткай, хлопец трапіў у салон, завёў аўто, а па прыездзе дадому зняў з яго акумулятар.

Дзень быў працягнуты адпачынкам з сябрамі і алкаголем. Увечары маладому чалавеку здалося, што ўкрадзены аўтамабіль ён няўдала прыпаркаваў каля дома, і хлопец папрасіў сяброў адагнаць яго далей, у менш прыкметнае месца. Аднак сустрэчы з міліцыяй усё роўна пазбегнуць не ўдалося. Малады чалавек быў затрыманы ў сябе дома аператыўнікамі крымінальнага вышуку. У зробленым зламысніку адразу прызнаўся, а таксама расказаў аб яшчэ адной няўдалай спробе крадзяжу аўто ў красавіку гэтага года. Дарэчы, раней хлопец прыцягваўся да адказнасці за рабаванне.

### Навошта забіў лебедзяў?

**Двух лебедзяў незаконна здабыў на вадаёме каля вёскі Вішнёўка Мінскага раёна 30-гадовы мінчанін, які прыехаў адпачываць на лецішча ў гэтыя мясціны.**

Як расказалі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, мясцовыя жыхары чулі стрэлы, а потым бачылі нецвярозага дачніка са стрэльбай, і паведамілі пра гэта ў міліцыю і Мінскую абласінспекцыю. Парушальніка затрымаў участковы, ён зараз у ізалятары. А дзяржінспектары знайшлі дзвюх забітых ім птушак. Шкода, нанесеная прыродзе, ацэнена ў суму каля чатырох тысяч рублёў. У доме ў затрыманага выявілі 34 патроны, адшукалі стрэльбу, якую мужчына выкінуў непадалёку ад дачнага ўчастка. Яна была незарэгістраваная. Цяпер стралку пагражае крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ Фестывалі

# Магія лічбаў у восеньскай музыцы

**Што аб'ядноўвае лічбы 43, 80, 28 і 10? На першы погляд, нічога, але для свету музыкі гэта сапраўдная магія: ужо 43-і раз у Мінску з 3 па 30 лістапада адбываецца «Беларуская музычная восень», якая сёлета прысвячаецца 80-годдзю Белдзяржфілармоніі і ўключае ў сябе 28 вялікіх канцэртаў ад музыкантаў з 10 краін.**

У філармоніі адзначаюць, што такой разнастайнай жанравай палітры фестываль яшчэ ніколі не бачыў, — будзе чым «паласавацца» аматарам камернай, арганнай, джазавай музыкі ды нават оперы.

У якасці самых важных падзей варта вылучыць юбілейныя канцэрты і творчыя вечары вядомых беларускіх музыкантаў: напрыклад, канцэртнай версіяй оперы Вердзі «Атэла» (у пастаноўцы італьянскага рэжысёра Карла Антонія дэ Лючыя) святкуе свой юбілей маэстра Аляксандр Анісімаў, разам з сімфанічным аркестрам выступіць кампазітар Сяргей Бельцюкоў (прадставіць харэаграфічную фантазію і павандровую па казках Караткевіча), пройдзе творчы вечар Яўгена Паплаўскага (слухачоў чакаюць прэм'ерныя «Адценні хараства»). Парадарожнічаць па Францыі запрашае вядомая беларуская оперная спявачка Надзея Кучар, якая ў 2015 годзе стала пераможцам BBC Singer of the World: «Salut a la France» — так называецца сольная праграма, з якой спявачка ўпершыню выступіць у Мінску. І тут будуць сапраўды ўсе адценні Францыі — прагучаць творы Ж. Бізэ, Г. Шарпанцье, Ш. Гуно, Л. Дэліба, Ж. Маснэ.



Мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі Юрый Гільдзюк раіць наведаць канцэрт новай камернай музыкі «Трамантана-3»: «Трамантана — гэта халодны вецер, і гэты подых сапраўды адчуе беларускі слухач. Маладыя беларускія кампазітары чарговы раз прадставяць новыя творы, якія прагучаць упершыню. Напрыклад, будзе «Музыка ветру для флейты і спяваючай тыбецкай чары», вакальны цыкл «Мы развучыліся слухаць цішыню», творы Воранава, Гарэлавай, Сімаковіч, Войціка і іншых».

Ужо шмат гадоў «Беларуская музычная восень» збірае найлепшых салістаў: народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў выканае творы Бетховена і Шапэна; салістка ансамбля «Класік-Авангард» Святлана Кудзіна выступіць з канцэртам «Piano solo»; ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Ігара Іванова прадставіць праграму «Восеньскі марафон». Таксама прагучыць і доўгачаканы джаз: у сталіцу завітае ўладальнік двух Грэмі, саліст шматлікіх аркестраў Марк Грос: пачуць можна свінг і боп, джаз-рок і мяккі джаз, які пераходзіць часам у поле рытм-энд-блюза.

Беларуская праграма будзе не менш насычаная, асабліва у Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча. Яго кіраўнік Міхаіл Казінец адзначае: «Наш калектыў падрыхтаваў адну з тых праграм, якія мы вельмі рэдка выконваем: доўгі час аркестр быў дугасным на сцэне, але цяпер нашы салісты — лаўрэаты міжнародных конкурсаў — выйдуць на першы план. Я лічу, што гэта вельмі смелы крок, бо слухачам сёння падабаецца дынаміка, а мы вырашылі звярнуць увагу на якаснае выкананне, чысты гук і мастацкі ўзровень нашых музыкантаў». Мастацкае слова дадасць фестывалю асаблівай паэтычнасці: тэатр аднаго акцёра «Зніч» адзначыць 135-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа паэтычным монаспектаклем «Красёнцы жыцця». Немагчыма ўявіць «Беларускую музычную восень» без Дзяржаўнага камернага аркестра. Канцэрт-закрыццё фестывалю стане першым з цыкла «Тры вечары з камерным аркестрам»: прагучаць 24 капрысы для скрыпкі з аркестрам Н. Паганіні, саліст — знакаміты Граф Муржа.

На працягу года ў будынку Белдзяржфілармоніі адбываецца каля 330 канцэртаў: кожны дзень — новая музыка, пераасэнсаванні і бессмяротная класіка. Сёлетняя «Беларуская музычная восень» — гэта маленькая версія цэлага году: за адзін месяц слухач атрымае асалоду ад музыкі некалькіх стагоддзяў і некалькіх кантынентаў.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР**

# ТАНЦАВАЛЬНЫ ЮБІЛЕЙ

**XXX Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (IFMC) пройдзе з 15 па 19 лістапада**

**Юбілейны фестываль аб'яднаў артыстаў з Аўстраліі, Аўстрыі, Беларусі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Ізраіля, Іспаніі, Італіі, Канады, Малдовы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, Румыніі, Славеніі, ЗША, Украіны, Францыі, Харватыі, Чэхіі, Японіі. Павіншаваць любімы IFMC прыедуць лаўрэаты конкурсу сучаснай харэаграфіі ў Віцебску розных гадоў.**



Цэнтральная падзея фестывалю — Беларускі конкурс сучаснай харэаграфіі. Удзельнікі, якія прайшлі першапачатковы адбор, выступяць перад міжнародным экспертным журы ў канцэртнай зале «Віцебск» і Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа на працягу фестывальнага тыдня. Адабраныя журы фіналісты з'явяцца перад гледачом 18 лістапада ў заключным туры.

— Фестываль унікальны не толькі па сваёй эстэтычнай культуры, але і па ролі, якую ён выконвае ў развіцці харэаграфічнага мастацтва Беларусі, — заўважыў **першы намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Уладзімір РЫЛАТКА.** — Доўгі час Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску быў адзінай крыніцай інфармацыі аб танцавальным жыцці краіны, бо амаль 20 гадоў у яго не было аналагаў, і менавіта IFMC запаліў агеньчыкі іншых фестываляў такога кшталту. Гэта апора сучаснай харэаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь.

Падчас прэс-канферэнцыі, зладжанай напярэдадні фестывалю, намеснік генеральнага дырэктара па спецыяльных праектах ГУ «Цэнтр культуры «Віцебск» Марына Раманоўская падрабязна расказала пра тое, чаго чакаць ад юбілейнага IFMC. Распачнецца фестываль паказам фільма «Пасля цябе», галоўнай тэмай якога з'яўляецца складаны лёс харэографа. На прэм'еру прыедуць рэжысёр фільма Ганна Матысон і выканаўца галоўнай ролі народны артыст Расіі Сяргей Бязрукаў. На канцэрце ўрачыстага адкрыцця Сяргей Бязрукаў уручыць спецыяльную ўзнагароду за значны ўнёсак у развіццё сучаснай харэаграфіі. Хто атрымае гэты прыз, пакуль трымаюць у сакрэце.

Акрамя конкурсных выступаў, для жыхароў і гасцей Віцебска падрыхтавалі насычаную праграму. На фестываль прыедуць тэатр «Балет Масква» (Расія), кампанія танца «VerTeDance» (Чэхія), «ZAWIROWANIA DANCE THEATRE» (Польшча), тэатр «Балет Яўгена Панфілава» (Расія), тэатр «Кіеў мадэрн-балет» (Украіна), Нацыянальная кампанія танца Іспаніі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны, народны артыст Малдовы харэограф Раду Паклітару заначыў: такой афішай можа пахваліцца далёка не кожны еўрапейскі фестываль, і Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску — вельмі сур'ёзная падзея ў харэаграфічным свеце.

IFMC не абмяжоўваецца толькі харэаграфіяй, але звяртае сваю ўвагу і на іншыя віды мастацтва: фае канцэртнай залы «Віцебск» упрыгожаць работы Аляксандра Салівончыка, фотапраект Ганны Майсяюк «Каліграфія танца» і выстаўка-інсталяцыя «Музей-архіў», прысвечаная 30-годдзю фестываля, якая адлюстроўвае гісторыю развіцця IFMC ад часоў СССР да нашых дзён. Запланаваныя майстар-класы ад вядомых танцоўшчыкаў з Беларусі, Расіі ды Польшчы, прэс-канферэнцыі, прэзентацыі кніг, прысвечаных танцу.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.**

■ Друкуецца ў «ЛіМе»

# САМОТНЫ МУШКЕЦЁР

***Чаму я назваў Якуба Коласа мушкецёрам? Бо менавіта такім яго ўбачыў Заір Азгур, калі першы раз прыйшоў «ляпіць» паэта: «Перада мной сядзеў чалавек з вусікамі і з эспаньёлкай у такой рамантычнай позе, што раптам здаўся падобным на аднаго з герояў Аляксандра Дзюма».***

Так аўтара «Новай зямлі» яшчэ ніхто не апісваў. Азгур як пісьменнік паказаў нам нечаканы партрэт Якуба Коласа. О, каб і скульптурная выява паэта на плошчы, што носіць яго імя, мела б такую ж мастацкую нечаканасць! Але тут Заір Ісакавіч, забыўшыся на свае дзівосныя ўражанні, вылепіў міфалагічны варыянт класіка. Менавіта такім Якуб Колас паўстае са школьных падручнікаў, шматлікіх ілюстрацый, юбілейных календароў і медалёў: мажны, нават таўставаты, строгі, па-радзецкаму мудры.

А ў сапраўднасці?

Амаль усё жыццё важыў не больш за 60 кілаграм, кожную раніцу сек дровы (расколваў нават самае вялікае палена з першага разу). Калі ж пасля 1944 года пачалі адужваць хваробы, з-за якіх стаў папраўляцца, то ў лісце да Алесі Смоліч (5 студзеня 1950 г.) пісаў: *«...я стаў таўсцець, а тоўстых я ніколі не любіў, а самога сябе я за гэта ўзненавідзеў».*

Калі ўжо пры жыцці з яго пачалі рабіць бронзавы вобраз, ён 16 лістапада 1952 года іранічна пісаў:

*Не ведаю, папраўдзе, што сказаць:*
*Ці радавацца мне ці гараваць.*
*Прызнаны я пясняр народа,*
*І не адна мне нагарода.*

*Бяда ж у тым, мае сябры,*
*Што я, браточкі, — грыб стары.*

*Ды ўсё ж адзнач штрых адзін —*
*З прыемнасцю глядзеў на балерын.*

...І не толькі. Ён, аматар раманаў Вальтэра Скота, заўсёды гатовы быў захапіцца якой-небудзь прыгажуняй. Адчуваў сябе сапраўдным рыцарам. Сэрца было адкрыта для рамантычных прыгод, а часцей для пакут ад неразделенага кахання. Жонка называла яго «благаняверны» (што згадваецца ў лістах), а ён, калі знаходзіўся ў эвакуацыі ў Ташкенце, пісаў у дзённіку (31 кастрычніка 1943 г.):



«Святлана? (перакладчыца Святлана Сомава. — **Аўт.**) Мая мара, маё самае лепшае, што дае жыццё. Але яна не хіліцца да мяне».

Пасля шасцідзесяці Якуб Колас стварае сапраўдныя шэдэўры любоўнай лірыкі. Прытым ні ў 1910-я, ні ў 1920-я гады вершаў пра каханне мы ў яго практычна не знойдзем. Перакладчыца Святлана Сомава натхняла яго, напрыклад, на такія акварэльна-лёгкія радкі, складзеныя 31 жніўня 1943 года:

*Быў у Ташкенце Колас Якуб,*
*Быў і рассыпаўся дзесьці.*
*А ці сарвецца з каралавых губ:*
*«Пачуць бы аб Коласе весці?»*

Лёгкасць — гэта ўвогуле тое слова, якое найбольш пасуе з усіх беларускіх паэтаў менавіта Якубу Коласу.

Яму быў аднолькава далёкі вывераны неакласіцызм Максіма Багдановіча з мотална-спакойным чаканнем смерці, калі герою «нат і не шкада, / Што хутка будзе ён зямлёю», так і псіхапаталагічны мадэрнізм Янкі Купалы, дзе «на пацеху сляпой дзічы /.../ Вырывай з сябе жылу па жыле, / Ві ў вяроўку, ў пятлю і павесся, / І, пакуль у зямлю не зарылі, / Хоць дух будзе шыпець у бяссіллі, / — На сваіх вісі жылах і смейся!».

Творчы саюзнік Якуба Коласа — Марк Шагал. У адзін час (1908—1918 гг.) яны ўздымаліся над усім жорсткім, брыдкім, фізіялагічна-невыносным, стваралі сваю фантасмагарычную казку, луналі ў ёй свабоднымі птахамі. Як і Шагал, ён удзяліў вялікую ўвагу снам. Запісваў іх, імкнуўся разгадаць, многія свае творы ператвараў у дзівоснае сненне.

Бо што такое «Новая зямля»? Гэта выратоўны сон пра ідэальны, можна нават сказаць райскі, паралельны свет, куды ўцякаў вязень царскай турмы Якуб Колас.

Што такое «Сымон-музыка»? Сюррэалістычна-ўтапічная фантазія пра тое, як чыстае мастацтва перамагае пякельную рэчаіснасць. Такая перамога магчымая, вядома, толькі ў... сне.

Адна з самых прыгожых сцэн у «Сымоне-музыку» — эпізод на могілках. Выгнаны з дому, галоўны герой прыходзіць на магілу дзеда Курылы, адзінага блізкага яму чалавека. Сымон плача. І ад гэтых слёз...

*...яму так лёгка стала,*
*Як бы што яго ўзняло*
*І так ціханька гайдала*
*І так лёганька нясло.*
*Лёгка, вольна і лагодна,*
*Бы на крыллях светлых мар,*
*Ён лятае так свабодна*
*У клубах купчастых хмар.*

Сымон-музыка лунае ў сваім ідэальным вымярэнні. Прывід дзеда іграе на скрыпцы і натхняе яго на яшчэ больш смелыя палёты...

За дзевяць гадоў да смерці Якуб Колас здзіўляў сваімі шагалаўскімі фантазіямі Петруся Броўку: «Нядаўна мяне апанавала думка. /.../ Я яўляюся перад публікаю — а тут усе людзі вучоныя — і пытаюся: ці можа чалавек адарвацца ад зямлі і павіснуць у паветры? Мне скажуць: не /.../ ёсць закон усясветнага цягацення. А я знайшоў спосаб ліквідаваць гэта цягаценне, узяў сабе падняўся на крок, на два ды пайшоў разгульваць над галовамі свае аўдыторыі...» (22 кастрычніка 1947 г.).

Якуб Колас і Марк Шагал з аднолькавай пераканаўчасцю ўмелі глядзець на беспрасвецце свайго часу, глядзець з такой паэтычнай, фантазійна-адчайнай захапляльнасцю, горкай насмешкай, іранічным болем, што, як ні дзіўна, становіцца лягчэй. Яны адначасова і ўцякалі ад нашай рэчаіснасці, і разам з тым пераасэнсоўвалі яе боль, надаўшы яму балетную, па-дзіцячы бесклапотную бязважкасць...

**Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК**

## Лізавета БОБРЫКАВА:

# «БЕЛАРУСЫ ПАЧЫНАЮЦЬ З'ЯЎЛЯЮЦЦА НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ»

### Айчынныя кінематаграфісты атрымаюць на «Лістападзе» тэарэтычную і практычную падтрымку

**УЧОРА ў кінатэатры «Масква» разбітай аб штатыў талеркай абвясцілі адкрыццё XXIV Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», а сёння пачаліся яго конкурсныя паказы і работа індустрыяльнай платформы. Мы сустрэліся з каардынатаркай апошняй Лізаветай Бобрыкавай, якая расказала нам пра пітчынгі сцэнарыяў і кінапраектаў увогуле, а таксама пра дзень віртуальнай рэальнасці «VIR: CINEMA».**



***— Вы арганізуеце сцэнарны трэнінг, пасля якога праводзіце пітчынг сцэнарыяў. Каму аўтары будуць прадстаўляць свае праекты і ці будзе гэта мець для іх нейкі практычны эфект?***

— Існуе вялікая колькасць сцэнарных трэнінгаў, якія з'яўляюцца першай прыступкай да міжнароднай кінаіндустрыі. Пасля наведвання кінафестываляў ад Літвы да Берліна і Канаў я заўважыла, што ўсё гэта ўзаемазвязана: спачатку праект з'яўляецца на сцэнарным трэнінгу, потым на сцэнарным пітчынгу, на агульным пітчынгу, на пітчынгу Work & Progress і, нарэшце, у праграме кінафестывалю. Гэта вялікая міжнародная сям'я, дзе, можна сказаць, усе адно аднаго ведаюць. Мне нават падаецца, што адборшчык пазнае карціны, якія ён бачыў на іншых этапах іх існавання, і інтуітыўна аддае ім перавагу. Таму мы сканцэнтраваліся на двух найважнейшых у міжнародным сцэнарным кантэксце праграмах, якія прымаюць беларускія праекты, — Midpoint і Torino film lub і запрасілі іх прадстаўнікоў. Наша ідэя ў тым, што сапраўды цікавыя сцэнарыі, калі яны будуць прадстаўлены на нашым сцэнарным пітчынгу, гэтыя адборшчыкі возьмуць да сябе на навучанне альбо дадуць ім практычныя каментарыі па развіцці.

***— Колькі прыйшло заявак на сцэнарны пітчынг?***

— Больш за дваццаць. Мы сабіралі заяўкі на трэнінг Ганны Гудковай і планавалі па выніках гэтага трэнінгу вызначыць удзельнікаў будучага пітчынгу. Спачатку мы зрабілі тэхнічны адбор, каб гэта былі паўнавартасныя сцэнарыі менавіта беларускіх аўтараў, і гатовы спіс адправілі Ганне Гудковай, каб яна адабрала дзесяць удзельнікаў. Але з той прычыны, што паўнавартасных сцэнарыяў знайшлося не дзесяць, а чатыры, мы вырашылі дапусціць да трэнінгу ўсіх заяўнікаў, тым больш што самі аўтары часам лепшыя за напісаны ўпохапкі тэкст і маюць патэнцыял. Усё ж у нас няма яскраснай спецыяльнай адукацыі, але таленты ёсць, што адчуваецца праз інтарэсы і самі заяўкі. Яшчэ адной перашкодай для ўдзелу з'яўляецца тое, што мала хто гатовы працаваць на англійскай мове. Трэнінг будзе праходзіць на рускай, але пітчынг — на англійскай, і некаторыя праекты могуць на яго не трапіць толькі з-за таго, што іх аўтары не размаўляюць па-англійску.

***— Вы чыталі дасланыя сцэнарыі. Як іх пракаменціруеце?***

— Я не магу ацэньваць з пункту гледжання якасці, але разглядаю сцэнарыі з пункту гледжання патэнцыялу для міжнароднай аўдыторыі. Тут, на жаль, не знайшлося сапраўды цікавых гісторый, прынамсі, тое, як сюжэт падаецца, не выкрывае адпаведнага патэнцыялу. Цікава, што на сцэнарны пітчынг у асноўным дасланыя заяўкі з ідэямі мастацкага кіно, з якім заўсёды паўстае пытанне бюджэту, а мы ў тым ліку ацэньваем магчымасці рэалізацыі гэтых праектаў. А на пітчынг фільмаў BEL:CINEMA даслалі ў асноўным дакументальныя праекты. Атрымліваецца, ёсць шмат сцэнарыяў ігравых фільмаў, якія не даходзяць нават да пачатку вытворчасці, і ёсць шэраг дакументальных карцін, якія прапускаюць этап сцэнарнага трэнінгу.

**«На жаль, у нас няма паўнавартаснай базы вытворчых кампаній і развітога інстытута прадзюсавання, таму ўзнікаюць пэўныя цяжкасці з арганізацыяй капрадукцыі».**

***— Такое ж пытанне адносна перспектыў праектаў, што ўдзельнічаюць у пітчынгу BEL: CINEMA.***

— Мы скіраваліся на ментальна і тэрытарыяльна блізкія да нас кінаіндустрыі і кінафестывалі, якія працуюць з беларускімі праектамі і па сутнасці з'яўляюцца дзвярыма ў кінаіндустрыю. Пітчынгі ў Вільнюсе і Карлавых Варах якраз збіраюць найлепшыя работы з рэгіёна Усходняй Еўропы. Ідэя такая ж: мы хочам, каб пасля пітчынгу на «Лістападзе», у ідэале, праекты змаглі ісці далей. Усё залежыць ад самых праектаў, ад тэматычнага фокуса індустрый, ад унутраных абставін. Напрыклад, у мінулым годзе беларускія аўтары ўдзельнічалі ў пітчынгу на Вільнюскім кінафестывалі з магчымасцю атрымаць паездку на Канскі кінафестываль. Але на многіх фестывалях, у тым ліку Вільнюскім, адбіраюць толькі праекты краін, якія ўдзельнічаюць у фондзе падтрымкі еўрапейскага кіно Eurimages. Гэта галоўны еўрапейскі кінафонд, які акумулюе ўзносы краін-удзельніц і размяркоўвае іх на кінапраекты, прэм'еры якіх у 99 працэнтах выпадкаў адбываюцца на тым ці іншым еўрапейскім кінафестывалі. Eurimages праводзіць вялікую работу па падтрымцы праектаў на стадыі іх развіцця. Але з той прычыны, што Беларусь не ў Eurimages і, напрыклад, не ў Creative Europe, мы павінны былі шукаць тых, хто пакуль яшчэ прымае беларускія праекты. Калі ў нас будуць гісторыі поспеху, як у выпадку з пітчынгам на Вільнюскім кінафестывалі, таму што яго ўдзельнікі атрымалі тады вельмі добрыя водгукі, гэта будзе аргументам для нашага Міністэрства культуры, каб рухацца ў бок уступлення ў праекты накшталт Eurimages, таму што яны адкрываюць вялікія магчымасці. Тут ёсць грашовыя пытанні, але, як паказвае вопыт нашых суседзяў, яно таго вартае. Хацелася б, каб у Беларусі запрацаваў кінацэнтр, які б адказваў за міжнародныя стасункі. На жаль, у нас няма паўнавартаснай базы вытворчых кампаній і развітога інстытута прадзюсавання, таму ўзнікаюць пэўныя цяжкасці з арганізацыяй капрадукцыі, бо ў Еўропе між сабой супрацоўнічаюць прыватныя кампаніі, а не дзяржаўныя структуры. Як пляцоўка Індустрыі мы рады з дапамогай прафесійных гасцей падтрымаць і пракансультаваць па пытаннях уступлення ў Eurimages і праекта Закона па кінематаграфіі, арганізаваць абмеркаванне гэтых тэм з прафесіяналамі з краін, якія маюць добры вопыт і ўжо паказалі «вынікі» развіцця сваіх кінаіндустрый нацыянальнымі прэм'ерамі ў Канах і намінацыямі на Оскар. Прафесіяналы з Грузіі, Польшчы, Літвы — нашы частыя госці і з той прычыны, што ў гэтых краінах выдатна апошнія дзесяць гадоў развіваецца індустрыя, яны маглі б стаць для нас прыкладам.

***— Ці шмат заявак прыйшло на пітчынг BEL: CINEMA і што гэта былі за праекты?***

— 24 заяўкі, з якіх адабрана 8. Праўда, мы атрымалі некалькі запытаў з іншых краін, хоць пітчынг разлічаны толькі на беларусаў, і некалькі заявак прыйшло без трэйлера, і таму яны адсеяліся адразу. У цэлым з праектамі на BEL: CINEMA цікавей, хоць бы таму, што праз трэйлер лепш зразумелая задумка аўтара. Тым больш відаць, што ідэя ўжо ў развіцці, некаторыя з заяўленых праектаў ужо недзе пітчынгаваліся, большасць заяўнікаў мае вопыт. Мы ведаем, што ўсе ўдзельнікі здольныя правесці прэзентацыю на англійскай. Праўда, заявак было не так шмат, як хацелася б. Мы разлічвалі ўбачыць больш новых імёнаў, таму не ставілі жорсткіх абмежаванняў накшталт дзесяці фільмаў у стадыі постпрадакшн, але іх амаль не аказалася. На мой погляд, з пункту гледжання рэалізацыі гэта патэнцыйна моцныя работы, хоць бы таму, што дакументальны праект увасобіць прасцей.

***— Як нашы аўтары, у параўнанні з тым, як гэта адбываецца на буйных кінафестывалях, прадстаўляюць свае праекты і ці ўмеюць яны гэта рабіць?***

— Прадставіць свой праект на пітчынгу — не дар, гэтаму трэба вучыцца. Калі, напрыклад, у Грузіі ствараўся кінацэнтр, першараднай задачай для іх было навучыць кінематаграфістаў прэзентаваць свае праекты, бо гэта асаблівая мова, стандарты і рэгламент. Праўда, пітчынгамі звычайна займаецца прадзюсар, і тут паўстае асобная тэма інстытута прадзюсавання ў Беларусі, якога пакуль няма. Яшчэ я заўважыла, што нашы людзі не ведаюць, што такое пітчынг, і гэта зразумела, бо я не магу ўявіць, адкуль бы яны маглі пра гэта даведацца. Таму для нас паўстала пытанне, як усяму гэтаму навучыць у максімальна кароткі тэрмін. Мы ўдзячныя, напрыклад, прадстаўніку праекта B2BDoc network Алексу Шыраеву, які на мінулым «Лістападзе» растлумачыў нашым кінематаграфістам, што такое пітчынг і як на ім выступаць. Ёсць цудоўныя трэнеры, якія маглі б навучаць майстэрству пітчынгу, але ў Лістапада пакуль няма бюджэту, каб іх запрасіць. Спадзяемся на падтрымку Міністэрства культуры ў гэтым пытанні. Яшчэ можна дадаць, што з-за высокай канкурэнцыі якасць праектаў, што прадстаўляюцца на міжнародных пітчынгах, вышэйшая. А ў нас людзі часта крыўдзяцца за тое, што іх нікуды не ўзялі.

***— У мінулым годзе на індустрыяльнай платформе праходзіла так званае сцэнарнае сватанне, падобнае да сёлетняга сцэнарнага пітчынгу і агульнага пітчынгу. Ці з'явіліся нейкія вынікі?***

— Так, тады шмат сцэнарыяў былі ў большай ступені тэатральнымі. Было заўважна таксама, што аўтары ўвогуле не думаюць пра бюджэт, а гэты складнік павінен мецца на ўвазе ўжо на этапе сцэнарыя, каб потым не было сюрпрызаў. Нас крыху засмуціла, што амаль ніхто з тых, хто ў мінулым годзе прадстаўляў свае праекты на «сцэнарным сватанні», у гэтым годзе не з'явіўся зноў. Узнікае пытанне: навошта яны пішуцца? Відавочным вынікам стаў удзел беларускіх аўтараў у пітчынгу ў Вільнюсе. Нямецкі прадзюсар Сімона Бауман дала праектам высокую ацэнку. Адборшчык Берлінскага кінафестывалю Мікалай Нікіцін сказаў, што многія праекты, прадстаўленыя ў беларускай секцыі, былі нават цікавейшыя за праекты з асноўнага пітчынгу Вільнюскага кінафестывалю. Ёсць і ўскосныя вынікі — з'явілася невялікая група дакументалістаў, якія пачалі ўзаемадзейнічаць і адзін аднаму дапамагаць, напрыклад, у тэхнічных момантах, дзяліцца інфармацыяй, дзе якія конкурсы і куды можна падавацца. Прыемна таксама, што беларусы пачынаюць з'яўляюцца на міжнароднай арэне і ўдзельнічаюць у праектах міжнародных кінафестываляў. Таксама нашай ускоснай перамогай стане спецыяльная праграма беларускага кіно на сёлетнім Котбускім кінафестывалі ў Германіі. Ёсць дамоўленасці і з іншымі пляцоўкамі, якія таксама хацелі б зрабіць фокус на беларускім кіно. Увогуле, нашы маладыя кінематаграфісты пачынаюць бачыць альтэрнатыўныя варыянты і ведаюць, што, апроч Беларусьфільма з яго ўласным шляхам развіцця, ёсць сфера, скіраваная на міжнародныя фестывалі. Апошнюю мы і хочам папулярызаваць.

**«Мне нават падаецца, што адборшчык пазнае карціны, якія ён бачыў на іншых этапах іх існавання, і інтуітыўна аддае ім перавагу».**

***— Я думаю, што часткай індустрыяльнай платформы, цікавай менавіта масаваму гледачу, будзе дзень віртуальнай рэальнасці «VIR: CINEMA». Раскажыце пра яго.***

— На мінулым, пробным, дні віртуальнай рэальнасці ў нас таксама паказваліся фільмы, але меншага геаграфічнага ахопу, а сёлета мы вырашылі замахнуцца на міжнародныя карціны, тым больш фільмы віртуальнай рэальнасці зараз з'яўляюцца на найбуйнейшых кінафестывалях. У гэтым годзе мы пакажам васямнаццаць вельмі розных карцін. Безумоўна, іх можна паглядзець і дома, маючы акуляры, але, калі ты глядзіш кіно разам з некім, як і са звычайным кінапаказам, — гэта іншае пачуццё. Людзі будуць глядзець адначасова адно і тое ж і, калі здымуць акуляры, пачнуць дзяліцца ўражаннямі, таксама, як калі ў кінатэатры ўключаюць святло. На гэты ж дзень запланаваныя паўнавартасныя майстар-класы. Як дадатак да паказаў тут будзе спецыяльная зона, дзе беларускія мастакі будуць маляваць у віртуальнай рэальнасці. І яшчэ будзе такая цікавая рэч, якую я магу растлумачыць толькі на пальцах — ты надзяваеш шлем і аказваешся ў фільме, скажам, «Гадзіла». А потым нейкім магічным спосабам ты можаш атрымаць фатаграфію, дзе ты — у антуражы фільма. Мяне радуе, што ў нас з нашымі партнёрамі — галерэяй віртуальнай рэальнасці «ВІР» і кампаніяй «Felling films» — падобныя інтарэсы: мы імкнёмся не да масавасці, а хутчэй да нейкай элітарнасці. Наша праграма — гэта не стралялкі ў камп'ютарным клубе, а мастацтва.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

## ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ Открытым акционерным обществом «ДОРОРС»

**Лот №1**: Капитальное строение (телятник) с инв. №600/С-149893 общей площадью 886,60 кв. м, год постройки 1958. Капитальное строение (откормочник (телятник)) с инв. №600/С-149894 общей площадью 671,30 кв. м, год постройки 1978. Начальная цена продажи **280 000,00** (Двести восемьдесят тысяч белорусских рублей 00 копеек) с НДС. Задаток за участие в аукционе 10% от начальной цены продажи **28 000,00** (Двадцать восемь тысяч белорусских рублей 00 копеек) с НДС.

Объекты представляют собой одноэтажные кирпичные строения, перекрытия – деревянные балки, полы бетонные, проемы дверные и оконные деревянные.

Объекты расположены по адресу: **Республика Беларусь, Минская область, Минский р-н, Луговослободской с/с, 50/1 и 50, район деревни Обчак** на земельном участке с кадастровым номером 623684100001000674, предоставленном на праве постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав на земельный участок: водоохранная зона водозабора «Фелицианова», площадь 1,0224 га; охранных зонах ЛЭП напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,1214 га; охранных зонах ЛЭП напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,0328 га.

Аукцион состоится **4 декабря 2017 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 62, актовый зал. Продавец объектов – Открытое акционерное общество «ДОРОРС».

Аукцион проводится в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с №BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 01.12.2017 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – **04.12.2017 г. с 13.30 до 13.45** по месту проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с Открытым акционерным обществом «ДОРОРС» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 18.00. Контактный телефон продавца **8 (017) 240-62-19** (по организационным вопросам); **8 (017) 501-63-39 (осмотр)**. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: **8 (017) 398-29-44, +375 29 615-40-08** e-mail: **belinvo@tut.by**.

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего УП «Могилевская межрайбаза»

Лот №1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-114403 – Встроенное нежилое помещение магазина с подвалом,** площадью 196,5 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ул. Королева, 14, фундамент – ж/бетонные блоки, стены и перегородки – крупно-панельные, перекрытие – ж/бетонное.
Лифт грузовой с инв. № 41724003.
Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000004000206 (право аренды, доля в праве 7/200), площадью – 0,2963 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания жилого дома, встроенного нежилого помещения с подвалом, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Королева, 14.
***Начальная цена продажи: 214 348,94 белорусского рубля с учетом НДС. Сумма задатка 21 434,89 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | УП «Могилевская межрайбаза», УНП 700188685, г. Могилев, пр-т Димитрова, 31а |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, номер счета в формате IBAN BY21BPSB30121543370109330000, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 22 ноября 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 21 ноября 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 10 рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи |

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 05.08.17 и 26.09.17

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 72-41-14; 8-029-624-26-25; 8-044-738-18-99**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Подразделение департамента:** Управление по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

**Уполномоченный орган:** ИМНС Республики Беларусь по Железнодорожному району г. Витебска.

**Лот №1.** Капитальное строение с инв. №200/С-47103, наименование – сборочный цех, назначение – здание специализированное иного назначения площадью 989 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11М/2, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000681 площадью 3,4933 га. Составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение: участок 1, участок 2, ворота, ворота. Изолированное помещение с инв. №200/D-182124, наименование – складское помещение, назначение – складское помещение площадью 253,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11М/3-2. Имущество обращено в доход государства у ОАО «Строительный трест №9» (УНП 300029266). **Начальная цена:** 209 142 рубля. **Задаток:** 20 914,20 рублей.

**Лот №2.** Капитальное строение с инв. №200/С-45405, наименование – столярная мастерская, назначение – столярная мастерская площадью 403 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 39-й Армии, д. 54, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000352 площадью 1,9682 га. Имущество обращено в доход государства у ОАО «СУ-312» (УНП 391418303). **Начальная цена:** 52 650 рублей. **Задаток:** 5 265 рублей.

**Лот №3.** Капитальное строение «магазин» с инв. №200/С, общей площадью 185,7 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, д. 36, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000413 площадью 11,1176 га. Имущество обращено в доход государства у ОАО «Вистан» (УНП 300029332). **Начальная цена:** 39 960 рублей. **Задаток:** 3 996 рублей.

**Лот №4.** Изолированное помещение расположенно на 1-м этаже капитального строения с инв. №200/С-50901, общей площадью 291,3 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. Имущество обращено в доход государства у ОАО «Вистан» (УНП 300029332). **Начальная цена:** 63 720 рублей. **Задаток:** 6 372 рубля.

**Лот №5.** Изолированное помещение расположенно на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-50901, общей площадью 300,5 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. Имущество обращено в доход государства у ОАО «Вистан» (УНП 300029332). **Начальная цена:** 73 440 рублей. **Задаток:** 7 344 рубля.

**Лот №6.** Изолированное помещение расположенно на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-50901, общей площадью 229,8 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. Имущество обращено в доход государства у ОАО «Вистан» (УНП 300029332). **Начальная цена:** 49 680 рублей. **Задаток:** 4 968 рублей.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 08.12.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 04.11.2017 с 8.30 по 07.12.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782, ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Имущество продается в собственность без передачи права собственности на земельный участок, на котором оно расположено. Окончательное решение о предоставлении земельного участка принимается местными органами власти.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, копии учредительных документов, иностранным юр. лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63. Условие – наличие не менее 2 участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5% (Претендент на покупку). Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе предмета аукциона не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Государственная регистрация создания недвижимого имущества, реализованного на аукционе, возникновения, перехода, прекращения прав, ограничений (обременений) прав на него, осуществляется на основании представляемых победителем аукциона заявления, протокола о результатах аукциона, копии решения суда об обращении недвижимого имущества в доход государства (иного документа, являющегося в соответствии с законодательством основанием для постановки имущества на последующий учет), акта передачи имущества, а также технического паспорта, составленного организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним.

Организатор аукциона вправе снять лот с аукциона по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «АВТОУДАЧА ВМЕСТЕ с НЭФИС!»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (Далее – Организатор).

УНП 590828925. Зарегистрирован решением Гродненского облисполкома от 16.01.2008 г. № 2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей №590828925.

Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, аг. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры.**

«**Автоудача вместе с Нэфис!**»

**3. Территория проведения.**

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения.**

05.11.2017 г. – 31.01.2018 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

Смаль Арина Олеговна, ЧТУП «ЗападХимТорг», руководитель отдела маркетинга.

Члены комиссии:

1. Стасюк Евгений Владимирович, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по рекламным коммуникациям.

2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.

3. Драневич Наталья Николаевна, ООО «ЗападХимИнвест», юрисконсульт.

4. Хованская Ирина Вячеславовна, ООО «Фабрика Ромакс», главный бухгалтер.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Биолан», «Bimax», «AOS», «Sorti», реализуемой в дискаунтерах «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 05 ноября 2017 года по 10 декабря 2017 года включительно:

1. Совершить покупку с использованием дисконтной карты 7% «Остров чистоты» продукции торговых марок «Биолан», «Bimax», «AOS», «Sorti» на сумму 15 рублей и более, в сети дискаунтеров «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

2. Получить у кассира магазина анкету участника и заполнить ее, указав:

- фамилию, имя, отчество;
- возраст (полных лет);
- город;
- телефон для связи с указанием кода города либо кода мобильного оператора;
- почтовый адрес, индекс.

3. Приложить копию чека к анкете.

4. Вернуть заполненную анкету кассиру магазина.

К участию в Розыгрыше не допускаются лица, не указавшие свои ФИО, возраст, город, телефон для связи с указанием кодов, почтовый адрес и индекс и не приложившие копию чека.

Заполняя анкету Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

Участнику необходимо сохранить оригинал кассового чека вплоть до окончания Рекламной игры.

Анкеты, не соответствующие правилам данной Рекламной игры, в Рекламной игре не участвуют.

Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете, отсутствие копии чека, которая должна быть приложена к анкете, или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза.

Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой заполненной анкете с прикрепленной копией чека.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз, каждый раз заполняя анкету участника.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 74812,32 (Семьдесят четыре тысячи восемьсот двенадцать) рублей 32 копейки с НДС и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль «Фольксваген Polo» 2017 г. в. VIN: XW8ZZZ61ZJG013195. Объем двигателя 1598 см³.Тип двигателя: бензин. Механическая 5-ступенчатая КПП. Цвет: серебристый; страна ввоза – РФ<br>В том числе денежное вознаграждение: | 1 | 21710<br>3227,44 | 21710<br>3227,44 |
| 2 | Автомобиль «Фольксваген Polo» 2017 г. в. VIN: XW8ZZZ61ZJG014593. Объем двигателя 1598 см³.Тип двигателя: бензин. Механическая 5-ступенчатая КПП. Цвет: черный; страна ввоза – РФ<br>В том числе денежное вознаграждение: | 1 | 21710<br>3227,44 | 21710<br>3227,44 |
| 3 | Автомобиль «Фольксваген Polo» 2017 г. в. VIN: XW8ZZZ61ZJG014853. Объем двигателя 1598 см³.Тип двигателя: бензин. Механическая 5-ступенчатая КПП. Цвет: серебристый; страна ввоза – РФ<br>В том числе денежное вознаграждение: | 1 | 21710<br>3227,44 | 21710<br>3227,44 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 28 декабря 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 3-2 (ТЦ «Столица», центральная площадь торгового центра).

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

Для проведения розыгрыша используются лототрон и анкеты участников с копией чека.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Порядок проведения розыгрыша. Определение выигрышных анкет получателей призов происходит путем случайного вытаскивания 3 анкет с копией чека из лототрона.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители, выигравшие призы, будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка до 10 января 2018 года включительно.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т. п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) и оригинала кассового чека на покупку товаров, по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Каховская, 70а, пом. 8, с 11 января по 31 января 2018 г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни.

Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке (например, утеря или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза) победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звезда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» до 11.01.2018 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 335-07-06 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также на сайте www.ostrov-chistoty.by.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №3127 от 30 октября 2017 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

КЛАКСАН

# АФАРМЛЯЦЬ АЛЬБО ЧАКАЦЬ? — 
## вось у чым пытанне

**Дробныя дарожна-транспартныя здарэнні — гэта тое, з чым сутыкаўся практычна кожны кіроўца, і не так важна, які ў яго стаж. Рэальнасць такая, што ДТЗ адымаюць не толькі фізічнае і псіхічнае здароўе, але і час. Прачакаць супрацоўніка ДАІ можна гадзіну, потым яшчэ гадзіну афармляць сутыкненне — такое выб'е з каляіны як гарадскога, так і сельскага жыхара. Каб не губляць час, існуе так званы еўрапратакол, які ў нас правільна называецца паведамленнем аб дарожна-транспартным здарэнні. Што гэта такое і як гэта працуе — расказваем у нашым матэрыяле.**



### З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Гандлёвы прадстаўнік сталічнай арганізацыі Кацярына Н.** за рулём амаль 4 гады. «Аб еўрапратаколе даведалася, калі трапіла ў сваё першае ДТЗ. Я была вінавата: прыцерла іншы аўтамабіль. Іншы кіроўца сказаў выклікаць ДАІ, — расказала дзяўчына. — Прыехаў супрацоўнік аўтаінспекцыі, пытаецца ў пацярпелага, дзе ў яго пашкоджанні. А ён і паказаць не можа, паколькі ў яго толькі рамка нумара зламалася. А ў мяне была брудная машына, таму было відаць пашкоджанне, хоць у мяне прэтэнзій і не было. Супрацоўнік прапанаваў аформіць еўрапратакол».

Па словах Кацярыны, запоўніць бланк даволі проста. «Там дзве копіі, мы хутка іх запоўнілі і раз'ехаліся, — адзначыла яна. — Потым я паехала ў страхавую арганізацыю, калі нешта не так, то там табе ўсё тлумачаць. Дарэчы, у страхавой я і набрала сабе бланкаў. У суме такім чынам я афармила тры ДТЗ, у астатніх была пацярпелай».

— Гэта рэальна эканоміць час. Людзі, якія маладзейшыя, лёгка згаджаюцца на гэта, — падзялілася назіраннямі Кацярына. — А вось тыя, хто старэйшы, выклікаюць ДАІ. Вядома, калі гэта проста драпіна, то можна аформіць такі бланк. Калі нешта больш цяжкае — лепш выклікаць ДАІ. Калі знойдуць пры рамонце нешта яшчэ, пераацэняць, сума можа аказацца больш за 400 еўра ў эквіваленце.

### ГАВОРАЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

Каб разабрацца ва ўсіх тонкасцях еўрапратакола, мы звярнуліся ў Беларускае бюро па транспартным страхаванні. «Самае галоўнае для гэтага дакумента: памер нанесенай шкоды не павінен перавышаць 400 еўра, — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення метадалогіі, арганізацыі і актуарных разлікаў Раіса АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — Для выкарыстання гэтага паведамлення трэба выканаць пэўныя правілы, бо калі хоць адно з іх не рэалізавана, бланк лічыцца несапраўдным».

Знайсці гэтыя правілы вельмі лёгка — яны пазначаны на адваротным баку самога бланка. Так, дакумент не запаўняецца, калі нанесена шкода жыццю або здароўю, ДТЗ адбылося з удзелам больш чым двух транспартных сродкаў. Акрамя таго, нельга выкарыстоўваць бланк, калі ва ўдзельнікаў аварыі адсутнічаюць дагаворы абавязковага транспартнага страхавання грамадзянскай адказнасці ці вадзіцельскае пасведчанне. Таксама папера не афармляецца, калі ў вадзіцеляў ёсць прэтэнзіі з нагоды пашкоджанняў, вінаватасці ў здарэнні, а таксама па фізічным стане адзін аднаго.

Дзе ж узяць гэты дакумент? Бланк павінен выдавацца страхавой арганізацыяй пры заключэнні дагавора страхавання. «Калі з нейкай прычыны ў кіроўцы яго няма, то варта звярнуцца ў страхавую кампанію для выдачы альбо ўзяць гэты бланк на любой аўтазапраўачнай станцыі. На запраўках яны не ляжаць на бачным месцы, таму трэба папрасіць аператара, які абавязкова выдасць яго», — адзначыла спецыяліст.

Сёння з дапамогай паведамленняў аб дарожна-транспартным здарэнні афармляецца каля 30% усіх ДТЗ — і гэта пры тым, што іх у нас каля 80 тысяч. «Я сказала б, што гэта не мала. Можа, і не так шмат, аднак не трэба забываць, што тут ёсць строгія правілы і абмежаванне па суме. Акрамя таго, такое паведамленне існуе толькі з 2010 года, — дадала Раіса Александровіч. — Дарэчы, сёння сярэдняя сума страхавой выплаты — 500 еўра. У перспектыве парог памеру нанесенай шкоды можа быць павялічаны».

— Па сутнасці, гэта права выбару для ўдзельнікаў ДТЗ — выклікаць ДАІ ці аформіць такі бланк. Ёсць розныя абставіны аварыі, таксама людзі могуць ставіцца да сутыкнення па-свойму, — сказала Раіса Александровіч. — Хто ведае, можа, чалавек шмат гадоў збіраў на гэты аўтамабіль ці ўзяў вялікі крэдыт. Можа, ён упершыню трапіў у ДТЗ. Таму калі чалавек не ўпэўнены — лепш выклікаць ДАІ. Для вінаватага боку больш выгадна разысціся без супрацоўніка аўтаінспекцыі. Таму трэба знайсці ўзаемнае рашэнне, якое задаволіць усіх.

Сітуацыі для афармлення падобнага дакумента бываюць розныя. Напрыклад, калі кіроўца паркуецца на горцы, забывае паставіць аўто на ручнік, яно выпадкова скочваецца і драпае іншую машыну, то і тут можна аформіць еўрапратакол. Дарэчы, у такім выпадку вадзіцельскае пасведчанне ўладальніка пацярпелага аўтамабіля прад'яўляць не трэба, паколькі яго машына не рухалася.

Калі на паркоўцы выпадкова падрапаць іншы аўтамабіль, то аформіць гэты дакумент можна толькі разам з уладальнікам пацярпелага аўтамабіля. Самастойна гэтага рабіць нельга.

### А КАЛІ ВЫЙСЦІ ЗА РАМКІ?

Найважнейшае пытанне пры афармленні падобнага паведамлення — а як зразумець, што тваё пашкоджанне ацэняць у 400 еўра або менш? «Я не раіў бы афармляць такі бланк на гарантыйны аўтамабіль, — адразу паведамляе **начальнік упраўлення міжнародных адносін і пытанняў рэгулявання па ўнутраным і знешнім страхаванні Уладзімір АКСЕЛЬРОД.** — Таму што гарантыйныя аўтамабілі як правіла рамантуюцца ў дылера, дзе вельмі высокі кошт запчастак, а таксама немалы кошт гадзіны работы. Таму калі дзесьці на звычайнай СТА можна адрамантаваць аўто за 200 еўра, то ў дылера такая ж работа будзе ацэнена ў 400. Калі ж машына не на гарантыі, то можна зыходзіць з такога разліку: рамонт і афарбоўка аднаго элемента — 100—120 еўра ў сталіцы, 70—80 еўра — у вобласці. У залежнасці ад таго, колькі элементаў пашкоджана, можна і падлічыць прыблізную суму».

Трэба разумець, што ўсё гэта вызначаецца індывідуальна. Бываюць старыя аўтамабілі, для якіх выплата ў 400 еўра можа скласці чвэрць кошту ўсёй машыны. А ёсць дарагія аўто, у якіх адна фара каштуе 1000 еўра.

Здараюцца сітуацыі, калі афармляецца паведамленне аб дарожна-транспартным здарэнні, аднак потым аказваецца, што рамонт ацанілі не ў 400, а 500 еўра. Што ж рабіць у такім выпадку? «Розніцу вяртае вінаваты ў аварыі, — тлумачыць Уладзімір Аксельрод. — Калі афармляецца такі дакумент, то ўдзельнік аварыі не можа патрабаваць больш за 400 еўра са страхоўшчыка. Таму звяртацца трэба да вінОўніка — альбо ў добраахвотным парадку, альбо праз суд. Як правіла людзі, якія запаўняюць паведамленне, ведаюць гэта і што іх можа чакаць».

На жаль, з дапамогай падобнага паведамлення вадзіцелі часам спрабуюць падмануць страхавыя арганізацыі. «Ёсць вадзіцелі, якія запаўняюць бланк, раз'язджаюцца, а потым адзін з іх заўважае новае пашкоджанне, якое не ўказалі пры аварыі. Ні ў якім разе нельга ўносіць дадатковыя звесткі пасля аварыі. Бо бланк разлічаны на дваіх, копія ёсць у іншага кіроўцы. Калі бланкі не супадуць, то ў выплаце могуць адмовіць, — расказаў спецыяліст. — Дарэчы, некаторыя кіроўцы робяць так адмыслова — можа, атрымаў калісьці драпіну і вырашыў прыпісаць да гэтага ДТЗ. У нас працуюць сапраўдныя прафесіяналы, якія лёгка вызначаць, калі было здзейснена пашкоджанне. І калі кіроўца робіць гэта адмыслова, то ёсць падстава для ўзбуджэння справы аб махлярстве. Дарэчы, калі трапляеце ў дробную аварыю і карыстаецеся пратаколам, сфатаграфуйце на ўсялякі выпадак пашкоджанні — так вы абароніце сябе».

— Я і сам карыстаўся такім паведамленнем, — дадае Уладзімір Аксельрод. — Хоць ведаю гэты бланк на памяць, усё роўна нерваваўся. Нічога складанага няма, трэба чытаць правілы і рабіць усё па парадку. Калі расхваляваліся, то пасядзіце 10 хвілін, падумайце пра што-небудзь, а потым запоўніце.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

**Каментарый у тэму**

**Старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Беларусі Ганна БАНАДЫК:**

— У развіцці гэтага новага для нас кірунку зацікаўлены як страхавальнікі, так і ДАІ, паколькі такі метад спрашчае працэдуру афармлення ДТЗ шляхам пазбягання папяровай цяганіны і лішніх фармальнасцяў, дазваляе вырашаць дробныя ДТЗ самім яго ўдзельнікам, спрашчае работу супрацоўнікаў ДАІ. Такое паведамленне накіравана на зніжэнне затораў на дарогах і ў перспектыве, паэтапна, павінна атрымаць шырокае распаўсюджанне. Напрыклад, у краінах Заходняй Еўропы ўсе ДТЗ, у якіх няма пацярпелых, афармляюцца самімі яго ўдзельнікамі без выкліку паліцыі.

На сённяшні дзень можна канстатаваць той факт, што вышэйапісаны метад афармлення ДТЗ у Рэспубліцы Беларусь прыжыўся, пра што сведчаць адпаведныя лічбы. У 2010 годзе колькасць ДТЗ, афомленых такім чынам, склала толькі 1,2% ад агульнай колькасці страхавых выпадкаў. Розніца з цяперашняй сітуацыяй сапраўды істотная.

# ПА ЗАРПЛАТУ — ТОЛЬКІ Ў СУД?

## Праблема яе нявыплаты носіць характар індывідуальнай працоўнай спрэчкі

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Мінчанка, наша даўняя чытачка, паскардзілася на рэдакцыйную «гарачую лінію», што яе мужу некалькі месяцаў не выплачваюць заработную плату. Ён працаваў на адным з прадпрыемстваў у сталіцы кіроўцам пагрузчыка. Мужчына звольніўся адтуль яшчэ 11 верасня. Дагэтуль нявыплаты, па словах жонкі, былі цягам двух-трох месяцаў. Пасля звальнення канчатковы разлік з работнікам праведзены не быў. На прадпрыемстве нявыплату грошай работнікам тлумачаць запазычанасцю перад ім іншых арганізацый.**

Спробы рэдакцыі разабрацца ў праблеме самастойна плёну не далі. Напачатку ў арганізацыі, дзе працаваў муж заяўніцы, шараговыя работнікі быццам бы пайшлі насустрач і паабяцалі падняць патрэбныя паперы. Але праз нейкі час, калі журналіст зноў набраў той жа нумар, трубку зняла ўжо галоўны бухгалтар прадпрыемства. Яна ў катэгарычнай форме і даволі эмацыянальна адмовілася даць якую-небудзь інфармацыю, спасылаўшыся на канфідэнцыяльнасць звестак. «Я нават жонцы колішняга работніка не магу сказаць, колькі зарабляе яе муж».

З просьбай дапамагчы даць адказ на запыт чытачкі (жанчына ж спадзявалася) мы мусілі звярнуцца ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Неўзабаве атрымалі адтуль афіцыйны ліст.

«Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, разгледзеўшы ваш зварот, паведамляе, што пытанні, з якімі вы звярнуліся, носяць характар індывідуальнай працоўнай спрэчкі. І, у адпаведнасці з заканадаўствам, гэты спрэчны момант павінен разглядацца ў судзе па месцы дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі ў тэрміны, якія ўстаноўлены заканадаўствам (у трохмесячны тэрмін з дня, калі работнік даведаўся ці павінен быў даведацца аб парушэнні свайго права). Пры разглядзе працоўных спрэчак работнікі вызваляюцца ад платы судовых выдаткаў (артыкул 241 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

Трэба адзначыць, што, у адпаведнасці з заканадаўствам, органы дзяржаўнага кіравання правам вырашэння індывідуальных працоўных спрэчак не надзелены.

Акрамя гэтага інфармуем, што нагляд за выкананнем заканадаўства аб працы, у прыватнасці, несвоечасовай выплаты заработнай платы і канчатковага разліку пры звальненні, знаходзіцца ў кампетэнцыі дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь (далей — дэпартамент), службовыя асобы якога маюць права прыцягваць да ўстаноўленай заканадаўствам адміністрацыйнай адказнасці асоб, якія дапусцілі парушэнне працоўнага заканадаўства (Палажэнне аб дэпартаменце, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.07.2006 №959 «Пытанні Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь»).

Такім чынам, для вырашэння вашых пытанняў вы маеце права звярнуцца ў Мінскае гарадское ўпраўленне дэпартамента, якое знаходзіцца па адрасе: г. Мінск, пр. Пераможцаў, 23/3».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# КАМУНІЗМ І МІЛЬЁН СЛАНОЎ

## Што адбываецца ў Лаосе?

**Дзяржаў, якія дагэтуль прытрымліваюцца камуністычнай ідэалогіі, ва ўсім свеце засталося няшмат. Іх у прамым сэнсе слова можна пералічыць на пальцах адной рукі. Цікава, што гэтая «марксісцка-ленінская пяцёрка» размеркавана па двух кантынентах. Куба прадстаўляе Лацінскую Амерыку, а Кітай, В'етнам, Паўночная Карэя і Лаос — Азію. Ідэалогія іх аб'ядноўвае, аднак у кожнай з краін — сваe асаблівасці. Напрыклад, Лаос доўгі час трымаў закрытай сваю «бамбукавую заслону», а пасля абвяшчэння «чын таакан май» (новы эканамічны механізм), што дазволіла з дапамогай замежнага капіталу ствараць уласную прамысловасць і належную інфраструктуру. Не губляючы пры гэтым дзяржаўнай камуністычнай платформы. Якія ж перспектывы ў Лаоса?**

### ЛОДКІ СА СНАРАДАЎ

Спачатку зарыентуемся «на мясцовасці». Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка — дзяржава ў Паўднёва-Усходняй Азіі са сталіцай В'енцьян. На захадзе мяжуе з Тайландам, на ўсходзе — з В'етнамам, на поўдні — з Камбоджай, на поўначы — з правінцыяй Юньнань Кітая, на паўночным захадзе — з М'янмай. Лаос не мае выхаду да мора, гэта пераважна горная краіна. Рака Меконг цячэ па мяжы Лаоса з Тайландам і М'янмай, мяжу з В'етнамам падзяляюць горы Чыангшон. Клімат субэкватарыяльны мусонны, характарызуецца падзелам года на два сезоны — перыяд мусонных дажджоў з мая па кастрычнік і зімовы сухі перыяд з лістапада па красавік. Колькасць насельніцтва складае 6,75 мільёна чалавек. Значная частка жыхароў сканцэнтравана ўздоўж Меконга і каля сталіцы. Горныя раёны на поўначы і ўсходзе краіны мала заселены. У Лаосе пражывае каля 70 розных плямёнаў і народнасцяў. Усё шматнацыянальнае насельніцтва прынята дзяліць на тры групы: лаалум, лаа-тэнге і лаа-сунг. Кожная група ўключае плямёны і народнасці, аб'яднаныя агульнымі этналінгвістычнымі прыкметамі, месцам рассялення і укладам жыцця.

Лаос як дзяржава бярэ свой пачатак у XIV стагоддзі, калі краіна называлася Лан Санг Хом Кхаа («Краіна мільёна сланоў і белага парасона»). З гэтага часу адбываецца падзел плямёнаў тай і лаа, дарэчы, з нагоды ідэнтыфікацыі апошніх вядуцца спрэчкі паміж тайландскімі і лаоскімі гісторыкамі. Пасля заняпаду дзяржавы Лансанг тэрыторыя трапіла ў залежнасць Сіяма ў XVIII стагоддзі, а ў 1893 годзе паводле дагавора паміж Францыяй і Сіямам адышла ў склад каланіяльнай тэрыторыі французскага Індакітая.



Падчас Другой сусветнай вайны Лаос быў заняты японцамі, а ў 1949 годзе здабыў незалежнасць у рамках каралеўства на чале з манархам Сісаванг Вонгам. Унутраныя канфлікты ў канцы 1950-х гадоў прывялі краіну да грамадзянскай вайны, у якую пасля ўмяшаліся Паўночны В'етнам і ЗША. У гэты перыяд Народна-вызваленчая армія Лаоса (Патэт-Лаа) пры падтрымцы Паўночнага В'етнама кантралявала значную тэрыторыю на ўсходзе краіны. Баявыя дзеянні былі непасрэдна звязаныя з вайной у В'етнаме, паколькі па тэрыторыі краіны праходзіла значная частка «сцежкі Хо Шы Міна», па якой Паўночны В'етнам перакідваў свае войскі на поўдзень. Падчас вайны на Лаос было скінута каля 260 мільёнаў авіябомбаў, што нанесла вялікія страты мірнаму насельніцтву, прыродзе і гаспадарцы краіны.



У сярэднім выходзіла па 10 тон на кожны квадратны кіламетр тэрыторыі і тона на кожнага жыхара. 30% гэтых боепрыпасаў дагэтуль засталося ляжаць у зямлі. Амерыканскіх снарадаў, якія ўзарваліся, настолькі шмат, што мясцовыя жыхары дагэтуль шырока выкарыстоўваюць вялізныя гільзы ў паўсядзённым жыцці: з іх робяць платы, цыстэрны, вазы і нават лодкі.

Баявыя дзеянні ў Лаосе завяршыліся ў лютым 1973 года падпісаннем В'енцьянскага пагаднення. Парушыўшы яго, сілы Патэт-Лаа вясной 1975 года пачалі наступленне і ў жніўні занялі В'енцьян. На працягу некалькіх месяцаў структура кааліцыйнага ўрада была захавана, Патэт-Лаа праводзіла памяркоўную палітыку, але пасля ўзяла ўладу ў краіне цалкам у свае рукі. 2 снежня 1975-га кароль Сісаванг Вонг быў вымушаны адрачыся ад трона. Урад узначаліў Генеральны сакратар Народна-рэвалюцыйнай партыі Лаоса Кейсан Фомвіхан, які стаў фактычным кіраўніком краіны. Пры падтрымцы СССР і В'етнама была ўтворана Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (ЛНДР).

Ужо ў 1975 годзе ўлады Лаоса абвясцілі пра пераход на сацыялістычны шлях развіцця. У краіне было ўведзена цэнтралізаванае планаванне, разгарнуліся калектывізацыя і нацыяналізацыя. Тэарэтычнай асновай пераўтварэнняў стаў тэзіс Кейсана Фомвіхана, вылучаны яшчэ ў 1972 годзе, — аб пераходзе да сацыялізму «абыходзячы капіталістычную стадыю».

### ВЫХАД З ІЗАЛЯЦЫІ

У Лаосе дагэтуль захавалася аднапартыйная сістэма, кіраванне краінай ажыццяўляе Народна-рэвалюцыйная партыя Лаоса (НРПЛ) камуністычнага тыпу. Прэзідэнт Лаоса абіраецца парламентам на пяць гадоў. Урад узначальвае прэм'ер-міністр, прызначаны прэзідэнтам пры зацвярджэнні Нацыянальным сходам. Палітыка ўрада вызначаецца партыяй праз палітбюро з дзевяці членаў і ЦК — з 49. Новая канстытуцыя Лаоса, якая ўстанаўлівае парадак выбараў у парламент (Нацыянальную асамблею), была прынята ў 1991 годзе. Нягледзячы на аднапартыйную сістэму, выбары ў лаоскі парламент праходзяць часткова на альтэрнатыўнай аснове — напрыклад, на галасаванні мінулага года на 149 мандатаў прэтэндавалі 211 кандыдатаў. Пасля смерці Кейсана Фомвіхана, які ўзначальваў НРПЛ на працягу 36 гадоў, а краіну — 16, у Лаосе ўсталяваўся блізкі да кітайскага дзяржаўны рэжым, пры якім лідар партыі і дзяржавы застаецца на сваіх пасадах абмежаваную колькасць часу (максімальна на сённяшні момант — 10 гадоў), пасля чаго ідзе ў адстаўку і змяняецца другім членам кіраўніцтва НРПЛ.

У 1975 годзе ў Лаоса былі дыпламатычныя адносіны з 43 краінамі. Дзяржава асацыявала сябе з савецкім блокам і падтрымлівала цесныя сувязі з СССР, акрамя таго, у 1977-м з В'етнамам быў падпісаны дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве, што ўскладніла супрацоўніцтва з КНР. На працягу многіх гадоў у Лаоса і прazаходняга Тайланда былі нацягнутыя адносіны, якія выліліся ва ўзброеныя сутыкненні на межах на працягу 1987 года. Пасля тых падзей лідары двух краін падпісалі камюніке, якое стала сігналам да нармалізацыі адносін.

Пасля развалу савецкага блока Лаос пачаў актыўна развіваць рэгіянальныя сувязі. Выхад з міжнароднай ізаляцыі суправаджаўся развіццём і пашырэннем адносін з такімі краінамі, як Аўстралія, Францыя, Японія, Швецыя і Індыя. Былі нармалізаваны гандлёвыя адносіны з ЗША. У выніку ўжо ў 2005 годзе Лаос меў дыпламатычныя адносіны са 122 дзяржавамі. Пры гэтым ЛНДР праводзіць палітыку балансавання паміж трыма суседзямі: Тайландам, Кітаем і В'етнамам. У ліпені 1997 года краіна ўступіла ў АСЕАН, а ў 2013 годзе была прынята ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Важнай асаблівасцю знешняй палітыкі Лаоса з'яўляецца актыўнае прыцягненне замежнай дапамогі, прычым ад самых розных дзяржаў. Напрыклад, у 2005 годзе Японія выдзеліла ЛНДР дапамогу ў памеры 300 млн ен на закупку харчавання для ахвяр паводкі, спісала доўг у 594 млн ен, а таксама перадала рэспубліцы некалькі пачатковых школ. Паўднёвая Карэя ў тым жа годзе падарыла Лаосу апаратуру для школ, Бруней вылучыў грант на будаўніцтва ў В'енцьяне цэнтра для хворых на наркаманію, а Сінгапур з 1993 года дае грошы на будаўніцтва і мадэрнізацыю дарог. Акрамя таго, Лаос атрымлівае дапамогу ад ААН і ФАО.



### РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ СПРАВА

За першыя дзесяць гадоў існавання ЛНДР каля 80% знешніх бязвыплатных паступленняў атрымала ад сацыялістычных краін. Пасля развалу СССР сітуацыя, вядома, змянілася. Пашырэнне міжнародных сувязяў суправаджалася ўнутранымі эканамічнымі рэформамі. Ужо ў пачатку 1980-х гадоў улады ЛНДР пачалі «перавёрстваць» сваю палітыку. У 1986-м абвешчана аб пераходзе да ўкаранення «новага эканамічнага механізма» («чын таакан май»), а ў 1988-м прыняты Акт аб заахвочванні інвестыцый і Закон аб замежных інвестыцыях. Змест палітыкі «чын таакан май» вызначаўся трыма ключавымі момантамі: прыватызацыя і рэструктурызацыя дзяржсектара, заахвочванне замежных інвестыцый і пераход да рынку пры кантролі з боку дзяржавы.

Далейшыя пераўтварэнні ў Лаосе былі падобныя на палітыку «дой мой» у В'етнаме і рэформы Дэн Сяапіна ў КНР. У канцы 1980-х — пачатку 1990-х фактычна былі распушчаны калгасы: сялянская аднаасобная гаспадарка атрымала правы працяглага (часам пажыццёвага) карыстання апрацаванымі ўчасткамі, а таксама атрымання зямлі ў спадчыну. Пачалося актыўнае стымуляванне малога і сярэдняга бізнесу. У пачатку 1990-х дазволена ствараць прыватныя банкі і прадпрыемствы. У далейшым палітыка «чын таакан май» была працягнутая — закон, прыняты ў 2003-м, гарантаваў, што замежныя капіталаўкладанні не будуць нацыяналізаваныя.

Большасць дзяржаўных прадпрыемстваў былі прыватызаваныя, здадзены ў арэнду або ў канцэсію. Значную ролю пачаў адыгрываць замежны капітал. У Лаосе рэзка павялічылася колькасць занятых у прамысловасці дзякуючы прадпрыемствам, створаным на замежныя грошы. У асноўным краіна спецыялізуецца на зборцы прамысловай прадукцыі з замежных дэталяў і на экспарце сыравіны — металаў і лесу. Актыўнае развіццё атрымалі швейная і будаўнічая галіны. У краіне таксама дзейнічае каля 20 невялікіх заводаў, якія збіраюць хатнія электрабытавыя прыборы (фены, кандыцыянеры, кухонную тэхніку). Праўда, дамінуючай па колькасці занятых галіной дасюль застаецца сельская гаспадарка.

Турызм у Лаосе — прыбытковая сфера эканомікі краіны, заснаваная на выкарыстанні разнастайных рэкрэацыйных рэсурсаў. Яшчэ з 1993 года ўрад вызначыў ахоўныя прыродныя зоны (NBCA), якія складаюць 21% краіны, іх мяркуецца пераўтварыць у нацпаркі. Пасля завяршэння праграмы яны абяцаюць быць найбольш цікавымі і прадстаўнічымі паркамі ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

Прэзідэнт краіны і генеральны сакратар Цэнтральнага камітэта НРПЛ 80-гадовы Бунянг Ворачыт (быў абраны на пасаду летась падчас X з'езда) заклікаў «працягнуць рэвалюцыйную справу партыі па пераўтварэнні Лаоса ў багатую, дэмакратычную, цывілізаваную дзяржаву, па прасоўванні яго на шляху да сацыялізму», паведаміла газета «Правда». Паводле стратэгіі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2025 гады, штогадовыя тэмпы эканамічнага росту павінны складаць не менш за 7,5%. Як мяркуецца, ВУП у разліку на душу насельніцтва да 2025-га дасягне $4 тыс. (цяпер $1970). Вялікія спадзяванні — на знешнія паступленні. Прынамсі, кітайскія інвестыцыі сёлета ўзраслі амаль на 70 працэнтаў.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*



■ Руплівым гаспадарам

# САД З ПРАБІРКІ

**Чаму ў адных растуць буйныя яблыкі, а ў вас на такім жа сорце — драбяза? Кусты чорных парэчак не даюць ягад? Суніцы буйна цвітуць, а ўраджаю няма? Сярод лета ў зялёным садзе груша стаіць з чырвонай лістотай, гіне? Усё гэта можа сведчыць пра хваробы раслін. Але такіх праблем можна пазбегнуць, калі набываць пасадачны матэрыял, аздароўлены ад вірусных і бактэрыяльных патагенаў. Атрымаць падобныя саджанцы можна ў культуры in vitro.**



— Сёння некаторыя спажыўцы культуру in vitro звязваюць з геннамадэфікаваным матэрыялам. Маўляў, калі расліна з прабіркі, нешта тут нячыста. Насамрэч тут няма нічога агульнага, — расказвае **загадчык аддзела біятэхналогіі Інстытута пладаводства Наталля КУХАРЧЫК.** — Мы нічога не мяняем, проста вырошчваем расліны такімі, якія яны ёсць. Так, можна пасадзіць чаранок у полі, і з пупышкі, што знаходзіцца ў пазусе ліста, пойдзе парастак. А мы працуем з той жа самай вегетатыўнай пупышкай. У ёй пад мікраскопам выдзяляем раставы конус — мерыстэму (яна вельмі маленькая — некалькі міліметраў) і садзім у прабірку. Як будзе развівацца расліна, залежыць ад таго, якія хімічныя рэчывы нальём у пажыўнае асяроддзе. Яна можа расці ўверх, даваць карані, атожылкі ці нават зацвісці ў прабірцы. Гэта лабараторная праца, стэрыльная, асяроддзі цалкам штучныя, і таму матэрыял атрымліваецца дастаткова дарагі. У прабірках мы вырошчваем суніцы, парэчкі чорныя, чырвоныя і белыя, маліну летнюю і рэмантантную, ажыны, буякі, брусніцы, журавіны, бружмель, вінаград, а таксама прышчэпы пладовых культур. Наша асноўная мэта — дыягностыка на вірусы, знаходжанне здаровых ці лячэнне хворых раслін і атрыманне пасадачнага матэрыялу, які не змяшчае вірусаў. У культуры in vitro ёсць яшчэ адзін цудоўны плюс — каэфіцыент размнажэння. Калі з адной расліны суніц можна атрымаць 10—20 вусоў за сезон (з некаторых сартоў 30), тут некалькі дзясяткаў тысяч (тэарэтычна, хоць мільён), і ўсе будуць добрыя, жыццяздольныя і абсалютна ідэнтычныя адзін аднаму. У адной прабірцы можа быць аднačасова 30 і болей раслін.

***— Парасткі раслін, атрыманых з прабіркі, таксама захоўваюць усе асаблівасці сорта?***

— Культура in vitro дазваляе ўсё вырошчваць на сваіх каранях без прышчэплівання. Зараз мы так размнажаем вішні і слівы. Раней у бабуль у вёсках раслі коранеўласныя вішні, праўда, ягады на іх былі кіслыя. Зараз мы добрыя сарты, у тым ліку найноўшай селекцыі, размнажаем на сваіх каранях, бэз прышчэпы, любыя парасткі будуць тым жа сортам.

***— Якія перавагі ў саджанцаў з прабіркі?***

— Гэта здаровы матэрыял. Праблема ў тым, што расліны размнажаюцца вегетатыўным шляхам, мы іх рэжам, прышчэпліваем, чаранкуем, бяром вусы. Так перадаюцца ўсе хваробы (бактэрыяльныя, вірусныя, фітаплазменныя), якія назапасіліся ў раслін. Напрыклад, на ўчастку ў нас растуць парэчкі, куст дрэнна пладаносіць, затое ён прыгожы, вялікі, зялёны, і мы бяром з яго чаранкі. Але так мы толькі размнажаем хворыя расліны. У парэчак ёсць хвароба, якая прыводзіць да бясплоддзя. Расліна можа цудоўна расці, а ягад не дае. Часам падобныя кусты людзі пакідаюць як жывую агароджу, а гэта крыніца інфекцыі для суседніх садоў. Напрыклад, пупышкавы клешч можа пераносіць вірусы з парэчак — і на раслінах мяняюцца форма ліста і нават пах.

На рынку часта бачу: прадаюць прыгожую, шыкоўную расаду. На наступны год яе прывозяць да нас: кветаносы стаяць шапачкай, і толькі ягад пасля з іх не бывае. Магутная, вялікая расада, як правіла, тая, што не пладаносіць.

***— Лета і восень былі дажджлівыя. Ці адбілася гэта на раслінах?***

— Гэта лета садзейнічала развіццю вірусных захворванняў таму, што было не столькі вільготным, колькі халодным. Пры высокіх тэмпературах вірусы не развіваюцца. І ў гэтым годзе вылезлі ўсе хваробы. Але ёсць адзін станоўчы момант: калі актыўна развіваюцца вірусы, як правіла, відаць іх сімптомы. А яны вельмі характэрныя: жоўтыя плямы, некратычныя, каравыя лісты, няправільнай формы ліставая пласцінка, могуць быць змены памеру ліста. Звярніце ўвагу на клубніку, калі на ёй пара вялікіх лістоў і вельмі многа дробных. На парэчках у гэтым годзе вельмі добра відаць рэверсію і іншыя хваробы.





***— Ці існуюць сарты, устойлівыя да хвароб?***

— Сартоў, устойлівых да усіх вірусных хвароб, у прынцыпе не існуе. Вірус — гэта не грыбны патаген, які жыве звонку, не бактэрыя, якая сасуды баразніць так, што расліна гіне. Мы маем справу з пэўнай колькасцю хвароб, якія жывуць унутры клетак, ніякімі хімічнымі апрацоўкамі ці іншымі заходамі ў садзе вылечыць расліны нельга. Можна толькі дыягнаставаць, якія з раслін здаровыя, і размнажаць іх. Гэта асноўны метад, які выкарыстоўваецца ва ўсім свеце.

***— Калі ў садзе ёсць хваробы, ці ёсць сэнс там садзіць здаровыя саджанцы?***

— Тут важная жорсткая абарона саду. Вірусы бегаць не ўмеюць. Такія хваробы пераносяцца насякомымі (тля, клешч, цыкадкі, мядзяніцы і іншыя) і чалавекам (калі з секатарам прайсціся пасля хворых раслін па здаровых). Напрыклад, вірусы і фітаплазмы пераносяцца сокам раслін. Некаторыя вірусы пераносяцца пылком і насеннем, асабліва на маліне. Так, калі вы пасадзіце здаровую маліну ў заражаны малліннік, любы апыляльнік (пчала, муха) перанясе вірусы.

***— Атрымліваецца, каб мець здаровы сад, неабходна змагацца са шкоднікамі?***

— Калі расліны добра абараняеш, яны растуць дзясяткамі гадоў і не заражаюцца. З іншага боку, калі вірус і «прыляцеў», напрыклад, на вашы клубніцы, ён не размнажаецца імгненна, вы можаце паспець некалькі разоў сабраць ураджай, а пасля раскарчаваць матачнік, памяняць на добры матэрыял.

Наша лабараторыя працуе на вытворчасць здаровага матэрыялу з 1998 года. Упершыню ў Беларусі мы пачалі праводзіць тэсціраванне пладовых і ягадных культур на наяўнасць вірусаў. З тых часоў не толькі вырошчваем усе віды пладовых і ягадных культур, а памянялі нават стандарты на пасадачны матэрыял. Калі раней ён быў толькі візуальна здаровы, то цяпер у нас ужо ёсць тэсціраваны на вірус. Практычна па ўсіх культурах ужо вызначана, якія хваробы самыя шкодныя, і атрыманы расліны свабодныя ад іх.

***— Саджанцы, атрыманыя з прабіркі, даволі дарагія, але наколькі яны акупаюцца?***

— Гэта тэхналогія акупаецца за кошт ураджаяў і не толькі. У Германіі мы наведвалі цэнтр, дзе сады высаджваюцца на адным і тым жа месцы многа гадоў. І фермер нават не шукае новыя землі, бо ўраджайнасць стабільная на працягу ўсяго пладанашэння, таму што сад першапачаткова здаровы і ён добра абараняецца. У нас сады пастаянна пераносяцца на новыя ўчасткі; адна з прычын таго, што зямля становіцца непрыдатнай — назапашванне хвароб. Думаю, што ў будучыні з абмежаваннем плошчаў прыйдзецца думаць аб гэтым.

***— Калі сад быў заражаны, на колькі гадоў «выбывае» зямля?***

— Вірус не пераносіцца зямлёй. Але расліны, якія захварэлі на вірус, спажываюць значна больш элементаў харчавання з глебы, таму што ім трэба карміць і сябе, і сваю хваробу. Мы праводзілі даследаванне: пасадзілі ў адным і тым жа месцы здаровую і хворую расліны. Хворая на 50—70 працэнтаў болей спажывала азоту, фосфару, калію.

***— А людзі думаюць, што, калі расліну добра падкарміць, яна будзе больш устойлівая да хвароб...***

— Я кажу не пра грыбныя захворванні ці шкоднікаў (там зусім іншая сістэма), а пра вірусныя і фітаплазменныя хваробы, якія не лечацца. Тут мы кормім не расліну, а яе ўнутраныя хваробы. Чалавеку, калі ён хварэе, не хочацца есці, арганізм сам падказвае. Тое ж і ў раслін.

***— Ці стала павялічвацца колькасць захворванняў? Усё ж сёння многія аматары пачалі заказваць саджанцы праз інтэрнэт.***

— Сапраўды павялічыўся абмен пасадачным матэрыялам, людзі шмат падарожнічаюць і імкнуцца нешта прывезці ў кішэнях. Але ж у такім выпадку ігнаруюцца ўсе каранцінныя мерапрыемствы, і гэта можа павялічваць колькасць хвароб. Не спяшайцеся заказваць і незнаёмыя кветкі ў сад. Вельмі многа агульных хвароб у кветкавых, агародных культур з пладовымі. Набывайце саджанцы ў праверанага вытворцы, прасіце дакументы. Напрыклад, ёсць людзі, якія прыязджаюць да нас за саджанцамі клубніц ужо на працягу 20 гадоў, бо бачаць, якая можа быць розніца, наколькі лепшы ўраджай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

■ Сезон

## У лістападзе — паляванне на пушніну

**З 4 лістапада (першай суботы месяца) пашыраецца пералік дазволеных спосабаў і прылад палявання на зайцоў (паляванне на зайца-русака і зайца-беляка з дыпламаванымі гончымі сабакамі стартавала ў Беларусі з 7 кастрычніка), а пералік дазволеных да здабычы пушных паляўнічых жывёл дапаўняецца вавёркай, лясной і каменнай куніцай, амерыканскай норкай, андатрай і лясным тхаром.**

Паляванне на зайца-русака і зайца-беляка дазваляецца ў светлы час сутак як зброевым, так і бяззброевым спосабам. Зброевая здабыча дазволена з засады, з падыходу, загонам. Дапускаецца выкарыстанне гладкаствольнай паляўнічай зброі з патронамі з дробам, а таксама паляўнічых сабак усіх парод, пры бяззброевым паляванні — хартоў і лоўчых птушак.

Зброевае паляванне на вавёрку, лясную і каменную куніцу, амерыканскую норку, андатру, лясного тхара дазволена ў светлы час сутак з падыходу, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі. Дазволенымі прыладамі зброевага палявання з'яўляюцца гладкаствольная паляўнічая стрэльбы з патронамі з дробам, наразная паляўнічая зброя калібру 5,6 міліметра, паляўнічая пнеўматычная зброя з дульнай энергіяй звыш 7,5 джоўля, але не больш за 25 джоўляў, а таксама паляўнічыя сабакі — усе пароды, акрамя ганчакоў і хартоў. Пры бяззброевым паляванні дазваляецца выкарыстоўваць капканы №0—3, пасткі (апроч петляў).



Паляванне на зайца-русака, зайца-беляка, вавёрку, лясную і каменную куніцу і лясного тхара, а таксама зброевае паляванне на амерыканскую норку і андатру працягнецца да 28 студзеня 2018 года (апошняя нядзеля месяца). Бяззброевае паляванне на амерыканскую норку і андатру будзе дазволена па 31 сакавіка наступнага года.

Як заўважылі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, найбольш папулярнымі аб'ектамі зброевага палявання з'яўляюцца заяц-русак і ліса, бяззброевага — лясная куніца

■ Пагроза

## Барацьба з баршчэўнікам — да перамогі

**Сёлета мерапрыемствы па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага выкананы па краіне на плошчы 2569,65 гектара, ці 88,7 працэнта ад агульнай колькасці вырастання (2895,43 гектара), паведамілі ў Мінпрыроды.**

У тым ліку метадамі: хімічным — на плошчы 621,61 гектара, ці 24,2 працэнта ад агульнай плошчы вырастання баршчэўніку Сасноўскага, на якой праводзіліся мерапрыемствы; механічным — 1668,068 гектара, ці 64,9 працэнта; камбінаваным — 180,641 гектара, ці 7 працэнтаў; іншымі спосабамі — 100,47 гектара, ці 3,9 працэнта.

Мерапрыемствы па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага вядуцца ў адпаведнасці з паказчыкамі, устаноўленымі Рэспубліканскім планам мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ў 2017 годзе, мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні населеных пунктаў у абласцях і Мінску на 2017 год.

У вясенне-летні перыяд бягучага года выяўлена 90 новых месцаў вырастання баршчэўніку Сасноўскага на плошчы 126,5 гектара ў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях.

Падчас кантролю за непрыняцце землекарыстальнікамі своечасовых мер па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага ўсяго складзена 285 пратаколаў аб адміністрацыйных парушэннях, накладзена штрафных санкцый на суму 31,744 тысячы рублёў.

Асноўная задача, пастаўленая міністрам прыродаахоўнага ведамства Андрэем Худыкам на 2018 год, — недапушчэнне далейшага распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ по объекту: «Район жилой усадебной застройки деревни Заценъ». 4-й пусковой комплекс. 1-я очередь строительства. Комплексная жилая застройка участка по ул. Заценъ, 6

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №190580566. Юридический адрес: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

– жилой дом №20 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 40 месяцев;

– жилой дом №12 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 24 месяца;

– жилой дом №14 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 47 месяцев;

– жилой дом №8 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 15 месяцев;

– жилой дом №10 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 13 месяцев;

– жилой дом №16 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 20 месяцев;

– жилой дом №29 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 18 месяцев;

– жилой дом №3А по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 7 месяцев;

– жилой дом №7Б по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 9 месяцев;

– малоэтажные жилые по ул. Заценъ 45А, 45Б, 45В, фактический срок строительства – 5 месяцев;

– жилой дом №123 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 27 месяцев;

– жилой дом №37А по ул. Каховская, фактический срок строительства – 52 месяца;

– жилой дом №121 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 18 месяцев;

– жилой дом №15 по ул. Павлины Медёлки, фактический срок строительства – 9 месяцев;

– жилой дом №5 по ул. Павлины Медёлки, фактический срок строительства – 10 месяцев;

– жилой дом №20 по ул. Выготского, фактический срок строительства – 12 месяцев.

Цель строительства района жилой усадебной застройки деревни Заценъ, 4-го пускового комплекса, 1-й очереди строительства, комплексной жилой застройки участка по ул. Заценъ, 6, общей площадью проектируемых жилых 7 516 кв. м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – декабрь 2016.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию объекта (согласно ПОС) – декабрь 2018.

Решения местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении строящихся граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, не принимались.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 01.08.2016 №449-15/16, от 07.04.2017 №91-15/17, от 26.07.2017 №515-15/17.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решением Мингорисполкома от 08.09.2016 г. №2596.

Получено разрешение Госстройнадзора от 22.12.2016 г., 27.02.2017, 28.03.2017 №2-209Ж-054/16.

Генеральный подрядчик – ОАО «Стройтрест №1» (договор генподряда №15 от 02.12.2016).

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 6,7% общей жилой площади.

В состав объекта «Район жилой усадебной застройки деревни Заценъ». 4-й пусковой комплекс. 1-я очередь строительства. Комплексная жилая застройка участка по ул. Заценъ, 6 входят:

– блокированные жилые дома на 2 квартиры №№ 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 по генплану;

– блокированные жилые дома на 8 квартир №№ 8, 9, 10,11 по генплану;

– усадебные жилые дома №№ 12, 13, 22, 25, 26, 27 по генплану;

– блокированный жилой дом на 5 квартир №15 по генплану.

Проектируемые жилые одноквартирные и блокированные дома расположены на территории района усадебной застройки Заценъ.

**Блокированные жилые дома на 2 квартиры №№ 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 по генплану.**

Блокированный жилой дом на 2 квартиры запроектирован двухэтажным в жилой части здания, одноэтажным в части помещений хранения автомобилей. Здание без подполья, с холодным не эксплуатируемым чердаком, кровля стропильная скатная с организованным наружным водостоком. Размеры в крайних осях 23,0х10,4 м. Высота первого этажа жилой части – 3,0 м, второго этажа – 2,7 м (от пола до потолка). Высота гаража – 3,15 м (от пола до потолка). Отметка конька кровли +8,510.

В жилой части здания предусмотрены помещения: на 1-м этаже – холл (гостиная), кухня, санузел, мини-котельная, тамбур; на 2-м этаже – три спальни, гардеробная, санузел, коридор. **Часть межкомнатных перегородок показана условно как вариант планировки.**

Связь между этажами осуществляется по внутренней лестнице. К жилой части пристроен гараж на 1 машиноместо с доступом из холла на 1-м этаже. Встроенная мини-котельная запроектирована с отдельным входом (со стороны дворового фасада) и окном.

Наружные стены жилой части здания предусмотрены из керамзитобетонных блоков, толщиной 400 мм с утеплением. Наружные стены гаража – из кирпича, толщиной 250 мм.

Внутренние перегородки запроектированы из пустотелого кирпича, толщиной 120 мм, в помещениях с влажным режимом – из полнотелого.

Окна приняты ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами (расчетное сопротивление теплопередаче не менее 1,0 кв. м град С/Вт). Наружные двери – стальные.

Наружная отделка:

- стены, цоколь – декоративно-защитный состав;
- металлические элементы фасадов, кровля – заводская отделка;
- ограждение крылец – из нержавеющей стали;
- облицовка ступеней и площадок – керамическая плитка.

Внутренняя отделка – проектом предусмотрена черновая подготовка под финишную отделку, установка внутриквартирных дверей не предусмотрена.

Квартиры для проживания инвалидов проектом не предусмотрены.

В каждой квартире блокированного 2-этажного жилого дома запроектированы самостоятельные системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения и бытовой канализации.

Источником теплоснабжения жилых домов являются двухконтурные газовые котлы.

**Блокированные жилые дома на 8 квартир №№ 8, 9, 10,11 по генплану.**

Блокированный жилой дом на 8 квартир запроектирован двухэтажным. Здание без подполья, с холодным неэксплуатируемым чердаком, кровля стропильная скатная с организованным наружным водостоком. Размеры в крайних осях 71,6х10,4 м (для домов №№8, 10, 11), 71,6х14,9 м (для дома №9). Высота первого этажа жилой части – 3,0 м, второго этажа – 2,92 м (от пола до потолка). Высота здания от отметки пола первого этажа до конька кровли – 8,83 м.

В каждой квартире предусмотрены помещения: на 1-м этаже – холл (гостиная), кухня, санузел, мини-котельная, тамбур, гараж на 1 машиноместо; на 2-м этаже – общая комната, две спальни, санузел. **Часть межкомнатных перегородок показана условно как вариант планировки.**

Связь между этажами осуществляется по внутриквартирной лестнице. Встроенная мини-котельная запроектирована с отдельным входом (со стороны дворового фасада) и окном. Из кухни предусмотрен выход на участок, примыкающий к дворовому фасаду.

Наружные стены жилой части здания предусмотрены из керамзитобетонных блоков, толщиной 400 мм с утеплением. Внутренние стены – из кирпича, толщиной 250 мм.

Внутренние перегородки запроектированы из пустотелого кирпича, толщиной 120 мм, в помещениях с влажным режимом – из полнотелого.

Окна приняты ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами (расчетное сопротивление теплопередаче не менее 1,0 кв. м град С/Вт). Наружные двери – стальные.

Наружная отделка:

– стены, цоколь – декоративно-защитный состав;
– окна – заводская отделка;
– металлические элементы фасадов, кровля – заводская отделка;
– ограждение крылец – покраска эмалью ПФ-115 по грунтовке;
– облицовка ступеней – керамическая плитка.

Внутренняя отделка – проектом предусмотрена черновая подготовка под финишную отделку, установка внутриквартирных дверей не предусмотрена.

Квартиры для проживания инвалидов проектом не предусмотрены.

В каждой квартире блокированного 2-этажного жилого дома запроектированы самостоятельные системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения и бытовой канализации.

Источником теплоснабжения жилых домов являются двухконтурные газовые котлы.

**Усадебные жилые дома №№12, 13, 22, 25, 26, 27 по генплану.**

Усадебный жилой дом запроектирован двухэтажным в жилой части здания, одноэтажным в части помещения хранения автомобиля. Здание без подполья, с холодным не эксплуатируемым чердаком, кровля стропильная скатная с организованным наружным водостоком. Размеры в крайних осях 12,65х7,0 м. Высота первого этажа жилой части – 3,0 м, второго этажа – 2,7 м (от пола до потолка). Отметка конька кровли – 8,83 м.

В жилом доме предусмотрены помещения: на 1-м этаже – холл (гостиная), кухня, санузел, мини-котельная, тамбур, гараж на 1 машиноместо; на 2-м этаже – три спальни, санузел, холл. **Часть межкомнатных перегородок показана условно как вариант планировки.**

Связь между этажами осуществляется по внутриквартирной лестнице. Встроенная мини-котельная запроектирована с отдельным входом (со стороны дворового фасада) и окном.

Наружные стены жилой части здания предусмотрены из керамзитобетонных блоков, толщиной 400 мм с утеплением.

Внутренние перегородки запроектированы из пустотелого кирпича, толщиной 120 мм, в помещениях с влажным режимом – из полнотелого.

Окна приняты ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами (расчетное сопротивление теплопередаче не менее 1,0 кв. м град С/Вт). Наружные двери – стальные.

Наружная отделка:

– стены, цоколь – декоративно-защитный состав;
– окна – заводская отделка;
– металлические элементы фасадов, кровля – заводская отделка;
– ограждение крылец – нержавеющая сталь;
– облицовка ступеней – глазурованная клинкерная плитка.

Внутренняя отделка – проектом предусмотрена черновая подготовка под финишную отделку, установка внутриквартирных дверей не предусмотрена.

Квартиры для проживания инвалидов проектом не предусмотрены.

В каждом здании запроектированы системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения и бытовой канализации.

Источником теплоснабжения жилых домов являются двухконтурные газовые котлы.

**Блокированный жилой дом на 5 квартир №15 по генплану.**

Блокированный жилой дом на 5 квартир запроектирован двухэтажным. Здание без подполья, с холодным неэксплуатируемым чердаком, кровля стропильная скатная с организованным наружным водостоком. Размеры в крайних осях 44,6х10,4 м. Высота первого этажа жилой части – 3,0 м, второго этажа – 2,93 м (от пола до потолка). Высота здания от отметки пола первого этажа до конька кровли – 8,83 м.

В каждой квартире предусмотрены помещения: на 1-м этаже – холл (гостиная), кухня, санузел, мини-котельная, тамбур, гараж на 1 машиноместо; на 2-м этаже – общая комната, две спальни, санузел. **Часть межкомнатных перегородок показана условно как вариант планировки.**

Связь между этажами осуществляется по внутриквартирной лестнице. Встроенная мини-котельная запроектирована с отдельным входом (со стороны дворового фасада) и окном. Из кухни предусмотрен выход на участок, примыкающий к дворовому фасаду.

Наружные стены жилой части здания предусмотрены из керамзитобетонных блоков, толщиной 400 мм с утеплением. Внутренние стены – из кирпича, толщиной 250 мм.

Внутренние перегородки запроектированы из пустотелого кирпича, толщиной 120мм, в помещениях с влажным режимом – из полнотелого.

Окна приняты ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами (расчетное сопротивление теплопередаче не менее 1,0 кв. м град С/Вт). Наружные двери – стальные.

Наружная отделка:

– стены, цоколь – декоративно-защитный состав;
– окна – заводская отделка;
– металлические элементы фасадов, кровля – заводская отделка;
– ограждение крылец – покраска эмалью ПФ-115 по грунтовке;
– облицовка ступеней – плитка.

Внутренняя отделка – проектом предусмотрена черновая подготовка под финишную отделку, установка внутриквартирных дверей не предусмотрена.

Квартиры для проживания инвалидов проектом не предусмотрены.

